# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ СТЫМУЛЯВАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На прэс-канферэнцыі па выніках выбараў Прэзідэнт выразна сказаў, што мы не збіраемся прынцыпова змяняць наш курс, радыкальна перабудоўвацца, каб дагадзіць камусьці. Не! Наш курс вывераны, нашы падыходы апраўданы жыццём, і адмаўляцца ад іх у нас няма ніякіх прычын. Але гэта не азначае, што мы збіраемся таптацца на месцы. У дакладзе Прэзідэнта на IV Усебеларускім народным сходзе пастаўлены такія мэты і задачы, якія шмат у чым патрабуюць калі не прынцыпова новых падыходаў, то істотнага зрушэння акцэнтаў па шэрагу напрамкаў нашай палітыкі. Гэта, перш за ўсё, датычыцца лібералізацыі эканомікі, развіцця прадпрымальніцтва, паляпшэння ўмоў для знешніх інвестараў, стабілізацыі знешнегандлёвага сальда і шэрагу іншых пытанняў.

У папярэдні перыяд галоўнымі задачамі для нас былі ліквідацыя развалу эканомікі, аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, выхад нашай прадукцыі на знешнія рынкі. Асноўным рэсурсам для вырашэння гэтых задач былі мабілізацыя рабочых калектываў, дысцыпліна, строгае дзяржаўнае кіраванне і кантроль выканання.

Сёння, калі пастаўлены задачы паскоранага развіцця ўсіх галін эканомікі на базе самых сучасных тэхнічных рашэнняў і тэхналогій, галоўным рэсурсам павінны стаць ініцыятыва і крэатыўнасць работнікаў. Пераход ад палітыкі дырэктыў да палітыкі ініцыятыў — вось галоўны лозунг новай пяцігодкі. І гэты падыход павінен быць успрыняты не толькі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, але, па сутнасці, і ва ўсіх астатніх сферах дзейнасці. Наш народ таленавіты, адукаваны і разумны. Сёння галоўная задача дзяржавы — ствараць умовы, пры якіх ён мог бы ў найбольшай ступені і з найбольшай карысцю праявіць свае здольнасці. Думаецца, што гэта тое, з чаго мы павінны зыходзіць пры арганізацыі ўсёй нашай работы.

Трэба таксама паклапаціцца і аб умацаванні ролі мясцовых Саветаў і асабліва аб далейшым развіцці нашай грамадзянскай супольнасці.

Сёння ў нас у краіне функцыянуюць больш як дзве тысячы грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, 15 палітычных партый. Аднак што гэта за партыі? Большасць з іх маюць не проста апазіцыйны, а варожа-апазіцыйны характар і адлюстроўваюць інтарэсы і погляды вельмі невялікай, радыкальна настроенай часткі насельніцтва. Некалькі партый даволі пазітыўныя, але яны занадта малаколькасныя і не могуць адыгрываць вызначальную палітычную ролю ў грамадстве. Асноўная ж частка насельніцтва — менавіта тая, што прагаласавала за Лукашэнку, — палітычна разрозненая і не ўваходзіць ні ў якія партыі. У выніку дэструктыўныя палітычныя партыі аказваюцца дамінуючымі на палітычным полі краіны і не атрымліваюць ніякага адпору, не маюць палітычнай процівагі з боку пераважнай часткі грамадства. Нельга не бачыць, што такая сітуацыя не служыць на карысць палітычнай стабільнасці. Толькі ж адміністрацыйнае стрымліванне экстрэмісцкіх тэндэнцый мае свае абмежаванні і наўрад ці поўнасцю вырашыць гэту праблему.

Таму партыйнае будаўніцтва, арганізацыя палітычных партый, якія адлюстроўваюць імкненні народа і прытрымліваюцца канструктыўных прынцыпаў, з'яўляюцца для грамадства важнай задачай. Безумоўна, патрэбны і павінны мець магчымасць для выказвання сваіх пазіцый і апазіцыйныя партыі. Без крытыкі, без апаніравання, без альтэрнатыўных меркаванняў грамадства паспяхова развівацца не можа. Але ў аснове дзейнасці такіх партый павінны быць няўхільнае выкананне Канстытуцыі, павага да законаў і высокая палітычная культура, якія не дапускаюць паклёпу, абразы і экстрэмізму.

На нядаўняй прэс-канферэнцыі Прэзідэнт выразна выказаўся ў падтрымку развіцця партыйнага жыцця ў краіне. Іншая справа, што ён катэгарычна не прымае бюракратычны прынцып арганізацыі і пабудовы нейкай прэзідэнцкай палітычнай партыі. І гэта абсалютна правільна. Па-першае, наш Прэзідэнт выбіраецца ўсім народам, выказвае і абараняе інтарэсы ўсяго народа, а не якой-небудзь яго асобнай часткі. Таму ён не збіраецца ўваходзіць ні ў якую партыю або ўдзельнічаць у яе стварэнні. Па-другое, партыя чыноўнікаў нам не патрэбна, яна нічога не прыбавіць грамадству. Гэта не значыць, што чыноўнік, як і любы грамадзянін, не можа знаходзіцца і актыўна праяўляць сябе ў партыі. Аднак перш за ўсё там павінны быць прадстаўнікі народа, а не ўлады.

І, нарэшце, апошняе, што я хацеў бы падкрэсліць у гэтай частцы свайго выступлення, — гэта наш курс на ўсямернае ўмацаванне дружалюбных сувязяў з краінамі-суседкамі і ў цэлым на актывізацыю міжнароднага супрацоўніцтва. Прэзідэнт абсалютна дакладна і адназначна выказаўся па гэтых пытаннях і на IV Усебеларускім народным сходзе, і на прэс-канферэнцыі, і мы цалкам падзяляем яго пазіцыю. Галоўнае — гэта тое, што беларуска-расійскія адносіны вяртаюцца ў нармальнае рэчышча і пачынаюцца калі не з чыстага ліста, то з ліста, з якога выключаны ўсе дапушчаныя раней памаркі. Расія была, ёсць і будзе нашым галоўным стратэгічным партнёрам, самай блізкай нам дзяржавай, і з гэтага нам усім трэба зыходзіць. Разам з тым мы спадзяёмся на значнае аздараўленне нашых адносін і з Еўрасаюзам, і з ЗША, з якімі мы хацелі б мець самыя цесныя і дружалюбныя адносіны.

Паважаныя калегі!

Новы этап развіцця краіны ставіць новыя задачы перад заканадаўцамі, патрабуе своечасовага ўдасканалення дзеючых норм і правіл. Кожны прававы дакумент павінен адлюстроўваць інтарэсы людзей, павінен быць накіраваны на стварэнне эфектыўна дзеючага механізма вырашэння актуальных задач. Інакш кажучы, усё, што працуе на карысць нашага народа, на карысць дзяржавы, павінна атрымаць якаснае нарматыўна-прававое замацаванне. Гэта тая канкрэтная задача, за якую мы з вамі нясём непасрэдную адказнасць.

На працягу пятай сесіі Савет Рэспублікі сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, Адміністрацыяй Прэзідэнта, Урадам і іншымі ўдзельнікамі заканадаўчага працэсу разглядаў і адабраў законапраекты, якія маюць самыя непасрэдныя адносіны да жыццёва важных праблем грамадства і дзяржавы. Так, адобраны Саветам Рэспублікі яшчэ ў кастрычніку, г.зн. за тры месяцы да пачатку планаемага года, пакет асноўных фінансавых дакументаў, якія вызначаюць бюджэтна-падатковую палітыку краіны на 2011 і наступныя гады, даў магчымасць усім удзельнікам сацыяльна-эканамічнага працэсу адаптавацца да новых «правіл гульні», устаноўленых гэтымі законамі. Своечасовае іх прыняцце мае асабліва вялікае значэнне ў сувязі з тым, што завяршаецца пяцігодка, і трэба без затрымак пачаць новую работу.

З навацый Бюджэтнага кодэкса варта адзначыць палажэнне, якое прадугледжвае залічэнне ў бюджэты Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню адлічэнняў ад падаходнага падатку фізічных асоб, што пашырае фінансавыя магчымасці мясцовых Саветаў.

У цэлым бюджэтная палітыка будзе накіравана на захаванне дасягнутай якасці сацыяльных паслуг, павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва, падтрымку рэальнага сектара эканомікі і стымуляванне малога і сярэдняга бізнесу.

Важную ролю для развіцця нашай эканомікі адыгрывае адобраны намі закон «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь». Ён прадугледжвае спрашчэнне падатковай сістэмы шляхам прывядзення яе па колькасці падаткаў, што прымяняюцца, у адпаведнасць са стандартамі развітых краін. У выніку падатковая нагрузка на эканоміку знізіцца на 0,4 працэнта адносна ВУП, а гэта больш як 700 млрд рублёў.

Закон пашырае інвестыцыйныя льготы, што, паводле падлікаў, павінна прывесці да павелічэння інвестыцыйных магчымасцяў айчынных прадпрыемстваў на 1,5 трлн рублёў. Важна таксама, што ён дае магчымасць істотна спрасціць працэдуры налічэння і выплаты падаткаў.

Паважаныя калегі!

Як вам вядома, 9 снежня бягучага года прэзідэнтамі Беларусі, Казахстана і Расіі была прынята Дэкларацыя аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы і сфарміравана яго дагаворна-прававая база. Уступленне дакументаў у сілу плануецца з 1 студзеня 2012 года.

Фарміраванне АЭП стане наступнай ступенню інтэграцыі краін — удзельніц Мытнага саюза. Яно будзе прадугледжваць свабодны рух тавараў, паслуг, капіталаў і рабочай сілы, а таксама ўзгодненую макраэканамічную палітыку.

Сённяшняе наша рашэнне аб ратыфікацыі пагадненняў па Адзінай эканамічнай прасторы мае, можна сказаць, гістарычнае значэнне, паколькі адкрывае дарогу для фарміравання прынцыпова новага эканамічнага саюза на прасторы СНД. Мы ратыфікавалі ўвесь пакет неабходных для гэтага дакументаў і зрабілі гэта раней за Расію і Казахстан — да 1 студзеня 2011, а не 2012 года. Для Беларусі гэта азначае зняцце з 1 студзеня 2011 года пошліны на нафту, якая пастаўляецца з Расіі для беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў, што мае для нас жыццёва важнае значэнне.

У ходзе сесіі адобраны пакет важнейшых законапраектаў у сферы сацыяльнай палітыкі. Перш за ўсё, узмоцнена сацыяльная абарона сем'яў, дзяцей, дзяцей-інвалідаў, а таксама непаўналетніх дзяцей, якія пражываюць і навучаюцца ва ўстановах адукацыі на тэрыторыях радыеактыўнага забруджвання. Удасканалены парадак назначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Выступаючы на IV Усебеларускім народным сходзе, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што адным з пяці паказчыкаў якасці жыцця чалавека з'яўляецца адукацыя. У сувязі з гэтым заканамерным з'яўляецца прыняцце асноўнага дакумента ў сферы адукацыі — Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, які будзе садзейнічаць сістэматызацыі заканадаўства і ўпарадкаванню адносін у гэтай сферы.

Важнае значэнне для эканомікі рэспублікі мае адобраны намі закон «Аб аднаўляльных крыніцах энергіі». Ён накіраваны не толькі на стварэнне эканамічных стымулаў выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі, але і на зніжэнне антрапагеннага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Прынятыя намі змяненні ў закон «Аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці» пашыраюць магчымасці ўдзелу грамадзян у вырашэнні пытанняў архітэктурнай і горадабудаўнічай палітыкі, што садзейнічае развіццю дэмакратычных працэсаў у нашым грамадстве.

Паважаныя калегі!

Шмат увагі ўдзялялася таксама ўдасканаленню крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага і адміністрацыйнага заканадаўства. Асаблівае значэнне маюць папраўкі, накіраваныя на яго лібералізацыю, змякчэнне адказнасці за няцяжкія правапарушэнні, у тым ліку ў галіне эканамічнай дзейнасці. Прыняты шэраг важных законаў, прызначаных гарантаваць бяспеку асобы, грамадства і дзяржавы.

На заканадаўчым узроўні комплексна ўрэгуляваны адносіны ў галіне знешняй працоўнай міграцыі, у тым ліку адносна пытанняў прыцягнення замежнай рабочай сілы ў Рэспубліку Беларусь.

У сесійны перыяд мы прадаўжалі нарошчваць прававую базу супрацоўніцтва з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. Саветам Рэспублікі адобраны міжурадавыя пагадненні з Кітайскай Народнай Рэспублікай, Фінляндскай Рэспублікай, Рэспублікай Польшча, Чарнагорыяй, Французскай Рэспублікай, Рэспублікай Перу, Усходняй Рэспублікай Уругвай і Туркменістанам. Ратыфікаваны таксама дакументы ў рамках Мытнага саюза.

У ліку ратыфікаваных міжнародных дакументаў — Рамачнае пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Паўночным інвестыцыйным банкам, якое адкрывае магчымасці выкарыстання фінансавых сродкаў гэтага банка для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, што ўяўляюць інтарэс для нашай краіны.

Паважаныя калегі!

Амбіцыйныя планы па развіцці Беларусі на наступнае пяцігоддзе павінны знайсці сваё нарматыўнае адлюстраванне ў законах, якія Парламент плануе разгледзець у будучым годзе.

Агучаныя кіраўніком дзяржавы на IV Усебеларускім народным сходзе стымулы, накіраваныя на ўмацаванне сям'і: павелічэнне памераў дапамогі па доглядзе дзіцяці, аднаразовай дапамогі пры нараджэнні дзіцяці і іншыя — павінны быць рэалізаваны ў адпаведных законах.

Паслядоўная палітыка дзяржавы, якая прадугледжвае забеспячэнне насельніцтва жыллём, запатрабуе ад нас стварэння прававой асновы для развіцця новых спосабаў паляпшэння жыллёвых умоў грамадзян. Наперадзе работа над праектам Жыллёвага кодэкса, законапраектам «Аб жыллёвых будаўнічых зберажэннях», актамі, што фарміруюць рынак арэнднага дзяржаўнага жылля і прадугледжваюць удасканаленне механізмаў іпатэкі.

Узмацненню абароны правоў грамадзян пры разглядзе іх зваротаў будзе садзейнічаць закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», работа над праектам якога павінна быць завершана ў наступным годзе.

Асаблівая ўвага будзе ўдзелена рабоце над законапраектамі, накіраванымі на актывізацыю прадпрымальніцкай ініцыятывы, павелічэнне прытоку інвестыцый, развіццё рынку каштоўных папер, далейшую лібералізацыю эканомікі. Пры гэтым трэба зыходзіць з формулы нашага Прэзідэнта: канкурэнцыя — усюды, дзе магчыма, дзяржаўнае рэгуляванне — там, дзе неабходна.

Нам трэба надаць дадатковую дынаміку міжнароднаму супрацоўніцтву. Гэты напрамак заканатворчай дзейнасці парламентарыяў павінен прыносіць рэальныя вынікі ў выглядзе росту колькасці экспартуемых тавараў і паслуг, прыцягнення ў краіну замежнага капіталу, умацавання эканамічных і палітычных адносін з замежнымі дзяржавамі.

За мінулы перыяд члены Савета Рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у міжнароднай і міжпарламенцкай дзейнасці. Сярод асноўных мерапрыемстваў можна адзначыць работу ў рамках Міжпарламенцкага Саюза, парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, Парламенцкай асамблеі і Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы, а таксама XIII Мінскага форуму «Беларусь і Еўрапейскі Саюз пасля крызісу». Удзел нашых прадстаўнікоў у гэтых структурах і мерапрыемствах садзейнічаў павышэнню аўтарытэту Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і ўмацаванню міжнародных пазіцый беларускай дзяржавы.

Хачу асабліва адзначыць пазітыўную ролю парламентаў Беларусі і Расіі ў пытанні нармалізацыі адносін паміж нашымі краінамі. Заявы наконт гэтага пытання, якія былі прыняты Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнай Думай Расійскай Федэрацыі, стварылі палітычную аснову для ўрэгулявання ўзнікшых непаразуменняў.

Гэтаму ж садзейнічала актыўная работа членаў Савета Рэспублікі ў рамках Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, міжпарламенцкіх асамблей дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Вельмі канструктыўна развіваліся і двухбаковыя парламенцкія кантакты. Адбыліся сустрэчы з парламентарыямі Бельгіі, Балгарыі, Венгрыі, Германіі, Грэцыі, Чарнагорыі, Фінляндыі, В'етнама, Азербайджана і інш., у ходзе якіх у якасці важнейшага прыярытэту разглядалася пашырэнне міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Шэраг паспяховых міжпарламенцкіх перагавораў быў праведзены ў сценах Савета Рэспублікі. Асабліва варта адзначыць сустрэчы з казахскай парламенцкай дэлегацыяй на чале са Старшынёй Сената Парламента Рэспублікі Казахстан, намеснікам Старшыні ПА АБСЕ панам Такаевым, з дэлегацыяй Вярхоўнай Рады Украіны на чале з намеснікам Старшыні Вярхоўнай Рады панам Таменкам, з дакладчыкам па Беларусі ад ПАСЕ пані Хурскайнен.

У маючы адбыцца міжсесійны перыяд асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць актывізацыі міжпарламенцкіх кантактаў на ўзроўні рабочых груп па супрацоўніцтве.

Паважаныя калегі!

У мінулы перыяд значная ўвага ўдзялялася рабоце з органамі мясцовага кіравання і самакіравання. У кастрычніку на базе Касцюковіцкага і Краснапольскага раёнаў адбылося выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянню з органамі мясцовага самакіравання, дзе была разгледжана работа Саветаў дэпутатаў названых раёнаў па комплекснаму развіццю тэрыторый і паляпшэнню ўмоў жыцця насельніцтва, асабліва ў частцы мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Па выніках абмеркавання вызначаны шляхі павышэння ролі Саветаў дэпутатаў у вырашэнні пытанняў у сферы занятасці насельніцтва, развіцця малога і сярэдняга бізнэсу, у рабоце па навядзенні парадку на зямлі і інш. Перад структурамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі пастаўлены канкрэтныя задачы па завяршэнні прыёму-перадачы вуліц і праездаў сельскіх населеных пунктаў на баланс спецыялізаваных арганізацый.

У рамках работы Савета па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання вялікая ўвага ўдзялялася ўкараненню АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». У прыватнасці, на базе Яноўскага і Беладубраўскага сельскіх Саветаў Краснапольскага і Касцюковіцкага раёнаў была апрабавана іх работа. Практыка паказала, што ўкараненне гэтай сістэмы створыць прынцыпова новыя ўмовы для больш эфектыўнай арганізацыі работы з дакументамі, дасць магчымасць пазбегнуць дубліравання працэдур рэгістрацыі, скароціць час дастаўкі карэспандэнцыі, знізіць матэрыяльныя і працоўныя затраты.

Вынікам поўнамаштабнага ўкаранення сістэмы павінна стаць комплексная аўтаматызацыя справаводства з далейшым пераходам на электронны дакументаабарот ва ўсіх органах мясцовага самакіравання Рэспублікі Беларусь.

Сістэмны характар атрымала наша ўзаемадзеянне з Саветамі дэпутатаў розных узроўняў. Падтрымка аказваецца ў першую чаргу сельскім і пасялковым Саветам дэпутатаў. Яны, як паказвае практыка, бяруць на сябе асноўную частку праблем жыхароў глыбінкі.

З нашым удзелам прайшло каля трыццаці сесій Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню.

Па-ранейшаму вялікае значэнне мы надавалі ўзаемадзеянню са сродкамі масавай інфармацыі. У лістападзе гэтага года ў Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча з рэдактарамі абласных, гарадскіх і раённых газет. Для нас выключна важна падтрымліваць цеснае ўзаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі, паколькі яны не толькі інфармуюць людзей аб тым, што робіць заканадаўчая ўлада, але і забяспечваюць зваротную сувязь: як насельніцтва ўсё гэта ўспрымае і ацэньвае. Важна, што рэгіянальныя друкаваныя выданні не ўпускаюць з-пад увагі агульнадзяржаўныя тэмы, на іх старонках можна сустрэць матэрыялы аб нашай парламенцкай дзейнасці і рабоце ў рэгіёнах. У прыватнасці, у 52-х перыядычных друкаваных выданнях за мінулы перыяд было размешчана больш за 200 публікацый аб дзейнасці Савета Рэспублікі. Разам з тым неабходна ўзмацніць работу ў СМІ па абмеркаванні законапраектаў, якія разглядаюцца ў Савеце Рэспублікі. Нашы грамадзяне павінны пастаянна атрымліваць з першых рук растлумачэнні і каментарыі заканадаўца па самых надзённых пытаннях.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У святле патрабаванняў кіраўніка дзяржавы аб укараненні ў практыку больш выніковых форм работы з насельніцтвам намі была ўзмоцнена работа са зваротамі грамадзян.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы на праведзенай 9 лістапада 2010 года нарадзе па пытаннях работы са зваротамі грамадзян, трэба выразна разумець, што для людзей важны не столькі паказчыкі ВУП, колькі тое, як дзяржаўныя праграмы ўплываюць на іх жыццё, садзейнічаюць вырашэнню надзённых жыццёвых праблем. Людзі чакаюць ад нас рэальнай увагі да іх клопатаў. Дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, прыняць зацікаўлены ўдзел у яго складанай жыццёвай сітуацыі, дапамагчы і падтрымаць — такім павінен быць наш стыль работы з заявамі і скаргамі выбаршчыкаў. Таму неабходна самым сур'ёзным чынам і ў Савеце Рэспублікі, і ў рэгіёнах займацца праблемамі людзей. У міжсесійны перыяд гэта задача нумар адзін. Тым больш што ў нас для гэтага ёсць усё неабходнае. Трэба смялей прыцягваць для работы з грамадзянамі мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, каб у максімальнай меры забяспечыць вырашэнне праблем насельніцтва.

Паважаныя калегі!

На заканчэнне хачу выказаць усім вам словы падзякі за плённую работу ў перыяд сесіі, а таксама падзякаваць супрацоўнікам Сакратарыята Савета Рэспублікі за высокі прафесіяналізм і якаснае выкананне пастаўленых перад імі задач па забеспячэнні дзейнасці Савета Рэспублікі.

Выказваю таксама ўдзячнасць прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі за аператыўнае асвятленне нашай дзейнасці.

Віншую ўсіх вас з надыходзячым Новым годам і жадаю вам і вашым блізкім здароўя, дабрабыту і ўдачы ў новым 2011 годзе!

Дзякуй за ўвагу!

# МАШТАБНЫМ ЗАДАЧАМ — ЭФЕКТЫЎНЫЯ ЗАКОНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спрошчаны працэдуры ў сферах архітэктурнай, будаўнічай і транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці. Аптымізаваны парадак прыцягнення ў краіну замежнай рабочай сілы.

Дзелавую ініцыятыву часта зводзяць на нішто неапраўдана суровыя санкцыі за парушэнне адміністрацыйных прадпісанняў.

Часткова зняць гэту праблему дазволяць магчымасць зніжэнне максімальнага памеру штрафу за парушэнні ў сферы эканамічнай дзейнасці і ўстанаўленне за асобныя віды правапарушэнняў такога спагнання, як папярэджанне.

Пазбегнуць працяглых судовых разбораў і звязаных з імі расходаў дапаможа рэалізацыя норм, накіраваных на развіццё практыкі вырашэння гаспадарчых спрэчак у дасудовым парадку. Гэта перш за ўсё выкарыстанне спрошчаных і прымірыцельных працэдур, стварэнне прававых умоў для больш шырокага прымянення інстытута трацейскага разбору.

Абароне законных інтарэсаў інвестараў і зніжэнню магчымасці ўзнікнення спрэчных сітуацый па здзелках з аб'ектамі нерухомай маёмасці паслужыць карэкціроўка Закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю».

Вызваляючы прадпрымальнікаў ад празмернага кантролю, дзяржава ў той жа час абавязана ў поўным аб'ёме абараніць правы работнікаў. І тут больш актыўную ролю павінны адыгрываць прафсаюзы. Умацаванню іх прававога статусу будуць садзейнічаць папраўкі ў Закон «Аб прафесійных саюзах».

Прынцып максімальнага ўліку інтарэсаў усіх удзельнікаў праваадносін з'яўляецца прыярытэтным і пры ўдасканаленні экалагічнага заканадаўства. Так, адначасова са спрашчэннем парадку карыстання аб'ектамі расліннага свету прапануецца ўвесці механізм кампенсацыі шкоды, што ім наносіцца ў выніку гаспадарчай дзейнасці. Акрамя таго, вырашаюцца задачы павышэння эфектыўнасці дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, захавання прыродных экалагічных сістэм, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці.

Разам са стварэннем аптымальных умоў для вядзення бізнэсу дэпутаты актыўна ўключыліся ў працэс фарміравання прававой базы для інавацыйнага абнаўлення эканомікі. Асноўныя напрамкі гэтай дзейнасці былі намечаны на парламенцкіх слуханнях, прысвечаных ролі навукі і адукацыі ў рэалізацыі стратэгіі інавацыйнага развіцця.

У ходзе сесіі ўнесены значны ўклад у кадыфікацыю заканадаўства. З прыняццем праекта Кодэкса аб адукацыі завершана складаная, карпатлівая работа па фарміраванні новай галіны нацыянальнага права. Закладзены заканадаўчыя асновы для стабільнага развіцця айчыннай сістэмы адукацыі і яе інтэграцыі ў сусветную адукацыйную прастору.

У першым чытанні прыняты праект Жыллёвага кодэкса. Улічваючы асаблівае гучанне, якое набыла жыллёвая праблематыка на Усебеларускім народным сходзе, далейшая работа над гэтым дакументам будзе праводзіцца з максімальным улікам выказаных пазіцый і меркаванняў.

У блоку сацыяльных пытанняў найбольш значнымі з'яўляюцца рашэнні, накіраваныя на ўзмацненне падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, устанаўленне льгот дзецям, якія навучацца ва ўстановах адукацыі, размешчаных на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, а таксама ўрэгуляванне адносін у галіне донарства крыві і яе кампанентаў.

Важкі пакет дакументаў быў прысвечаны ўдасканаленню работы праваахоўных органаў, умацаванню стабільнасці і правапарадку ў краіне.

Узмоцнены патрабаванні да правядзення аператыўна-вышуковай дзейнасці. Замацаваны пераўтварэнні ў структуры органаў унутраных спраў. Вядзецца карэкціроўка заканадаўства аб пракуратуры. Аптымізуецца сістэма прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. З улікам правапрымяняльнай практыкі ўнесены змяненні ў Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь.

Важным заключным акордам сесіі стала ратыфікацыя 18 міжнародных дагавораў, якія фарміруюць прававую базу Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі.

Насычанай і дынамічнай была міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў. Заканамерна, што важнейшым яе напрамкам у гэты перыяд была работа з замежнымі і міжнароднымі наглядальнікамі на прэзідэнцкіх выбарах.

Па запрашэнні Палаты прадстаўнікоў у краіне працавалі місіі наглядальнікаў ад Міжпарламенцкай Асамблеі СНД і Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якія мелі магчымасць аб'ектыўна ацаніць абстаноўку ў рэспубліцы і пераканацца ў тым, што выбары праходзілі ў поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам.

Актыўная работа праводзілася ў рамках міжпарламенцкіх арганізацый. Ключавой падзеяй тут стала 38-я сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Сярод асноўных яе рашэнняў — прыняцце праекта саюзнага бюджэту на 2011 год.

Плённа працавалі дэпутаты ў міжпарламенцкіх структурах СНД, ЕўрАзЭС і АДКБ. На пленарных пасяджэннях і іншых мерапрыемствах гэтых арганізацый былі абмеркаваны пытанні фарміравання прававой базы Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы ў рамках ЕўрАзЭС, умацавання яго парламенцкага складальніка, заканадаўчага забеспячэння інавацыйнага развіцця дзяржаў — удзельніц СНД, стварэння сістэмы крызіснага рэагавання ў АДКБ.

Праведзеныя ў рамках гэтых форумаў сустрэчы з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый Казахстана, Расіі, Таджыкістана і Украіны далі магчымасць абазначыць шляхі далейшага развіцця двухбаковага супрацоўніцтва і аказання ўзаемнай падтрымкі ў міжпарламенцкіх арганізацыях.

Адзначу таксама плённы ўдзел дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 123-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, асенняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, 36-м пленарным пасяджэнні Генеральнай асамблеі Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, штогадовай сесіі парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Дэпутаты актыўна выкарыстоўвалі трыбуну гэтых арганізацый, каб данесці пазіцыю нашай краіны па такіх актуальных пытаннях, як барацьба з транснацыянальнай злачыннасцю, карупцыяй і гандлем людзьмі, ахова навакольнага асяроддзя, змяненне клімату, энергетычная і харчовая бяспека.

Сярод важнейшых падзей сесійнага перыяду неабходна назваць афіцыйны візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам, у час якога адбыліся сустрэчы з Прэзідэнтам і Прэм'ер-міністрам гэтай краіны, кіраўніцтвам Парламента і прадстаўнікамі дзелавых колаў. Былі абмеркаваны пытанні развіцця беларуска-в'етнамскага палітычнага дыялога, гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, пашырэння ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях, у тым ліку шляхам устанаўлення партнёрскіх адносін паміж Парламентам Беларусі і Парламенцкай асамблеяй Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі.

Высокай была актыўнасць рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў. Упершыню адбыўся візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Эстонію, па лініі парламенцкіх груп дружбы ажыццёўлены візіт у Японію.

У снежні гэтага года прайшло трэцяе пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнай Рады Украіны, на якім абмяркоўваліся пытанні развіцця дагаворна-прававой базы дзвюх дзяржаў, гандлёва-эканамічных сувязяў, а таксама супрацоўніцтва нацыянальных дэлегацый Беларусі і Украіны ў міжнародных парламенцкіх структурах.

За апошнія тры месяцы ў Палаце прадстаўнікоў праведзена каля 10 сустрэч з парламентарыямі замежных дзяржаў, прадстаўнікамі міжнародных арганізацый і дыпламатычнага корпуса замежных дзяржаў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у складзе місіі наглядальнікаў ад СНД прымалі ўдзел у міжнародным назіранні за правядзеннем канстытуцыйнага рэспубліканскага рэферэндуму і парламенцкіх выбараў у Рэспубліцы Малдова, а таксама выбараў у Парламент Азербайджанскай Рэспублікі.

Дынаміка двухбаковых кантактаў не знізіцца і ў міжсесійны перыяд. Разглядаюцца прапановы аб ажыццяўленні візітаў беларускіх парламентарыяў у Бахрэйн, Іран і Украіну. Чакаецца, што нашу краіну наведаюць парламенцкія дэлегацыі Італіі, Карэі, Лівана.

Дэпутаты прымуць удзел у мерапрыемствах Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, міжпарламенцкіх асамблей СНД і ЕўрАзЭС, Парламенцкай Асамблеі АДКБ, а таксама ў зімняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Прадоўжыцца падрыхтоўка трэцяга сумеснага семінара дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у ПА АБСЕ і Рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі па пытаннях сродкаў масавай інфармацыі.

Напружанай будзе і заканадаўчая дзейнасць. Ужо сёння неабходна ўключыцца ў работу па падрыхтоўцы заканадаўчых ініцыятыў, кіруючыся рашэннямі Усебеларускага народнага сходу, перагледзець нашы рабочыя планы, прааналізаваць законапраекты, якія ўжо знаходзяцца ў пастаянных камісіях.

Мы набралі добры тэмп работы ў выбарчых акругах з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, мясцовымі органамі ўлады. Наша задача не знізіць яго і ў міжсесійны перыяд.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за плённую работу і выказаць упэўненасць, што пастаўленыя перад намі задачы будуць паспяхова вырашаны.

Сардэчна віншую ўсіх прысутных з надыходзячым Новым годам і Каляднымі святамі.

Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў і ўдачы ва ўсіх справах.

# Ад Польшчы да Кітая — рынак без межаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб інтэгравацца было лягчэй, Беларусь будзе максімальна прытрымлівацца ўмоў уступлення «старэйшай сястры» — Расіі. Ужо хоць бы таму, што ў той ёсць такая неабходная на перамовах вага. «Бо, як вядома, чым меншы эканамічны патэнцыял краіны, тым менш з ёй лічацца на перамоўным працэсе», — канстатуе А. Кабякоў. Праўда, перамовы па ўступленні Расіі доўжацца ўжо апошнія 18 гадоў... Як бы там ні было, ёсць шанец, што мы пойдзем па пракладзеным шляху.

Дамоўленасці ёсць, натуральна, і ў сельскагаспадарчай сферы. Так, нам, напрыклад, давядзецца істотна скарачаць меры дзяржаўнай падтрымкі аграрнага сектара. Яна будзе лімітавацца ў працэнтных суадносінах да валавога кошту выраблены сельскагаспадарчых тавараў.

Увогуле ж сярод ратыфікаваных парламентарыямі дакументаў — пагадненні аб узгодненай макраэканамічнай палітыцы ў АЭП, адзіных правілах і прынцыпах канкурэнцыі, дзяржаўных закупках. Асобны блок датычыцца энергетычнай і транспартнай сферы, адзіныя падыходы вызначаюцца ў сферы працоўнай міграцыі. Усё ўзважана, выверана і ўжо, як бачыце, адным бокам ратыфікавана. Аднак карэктывы не выключаны:

— Мы дамовіліся, што ўсю першую палову 2011 года, пакуль ідзе ратыфікацыя ў Расіі, Казахстане, будзем пільна глядзець, як бізнэс-супольнасць рэагуе на гэтыя пагадненні. Не выключана, што пры неабходнасці нешта будзе рэгулявацца асобнымі пратаколамі, — удакладняе намеснік прэм'ер-міністра.

**Старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей МАСКЕВІЧ** распавёў пра перспектывы, якія адкрывае для Беларусі ўдзел у Мытным саюзе і АЭП. Адзначыў, што гэта стане «пунктам адліку новага этапу развіцця краіны». Дэпутат падкрэсліў высокую зацікаўленасць трэціх краін у супрацоўніцтве. Свой інтарэс ужо праявілі В'етнам, Егіпет, Новая Зеландыя, Сірыя, Іран. «І мы хочам, каб агульны рынак у 170 млн чалавек быў для іх прывабным», — запэўнівае палітык. Яшчэ б, такі прастор для гандлю: ад Польшчы да самага Кітая ніякіх перашкодў.

Падчас абмеркавання дакументаў у верхняй палаце парламента **старшыня Савета Рэспублікі Анатоль РУБІНАЎ** канстатаваў, што завяршэнне ратыфікацыі пагадненняў па АЭП азначае ўтварэнне «новай эканамічнай, а магчыма, і палітычнай, рэальнасці». У гэтым ён бачыць адкрыццё шырокіх перспектыў не толькі для Беларусі — для ўсёй постсавецкай прасторы. **Старшыня пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Вадзім ПАПОЎ** звярнуў увагу на тое, што падпісанне і ратыфікацыя пагадненняў — гэта далёка не канчатковы этап развіцця, наадварот, ён азначае «наступны этап заканатворчай дзейнасці па паглыбленні інтэграцыйных працэсаў».

**Зоя ВАРАНЦОВА.**


## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 25 января 2011 г. проводит открытый аукцион № 01-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 3 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

| № п/п | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Пересечение улиц Космонавтов-Слободской | 500000000005005599 | 0,3728 | Торговый центр | 296 528 554 | 29 000 000 | 4 794 019 | – |
| 2 | У дома № 24 по ул. Голубева | 500000000005005598 | 0,2000 | Объект торговли с помещениями общественного питания | 165 296 124 | 16 000 000 | 4 762 543 | – |
| 3 | Микрорайон Каменная Горка-2, по генплану № 20 | 500000000006005862 | 0,3695 | Блок бытового обслуживания на 23 рабочих места с кафе на 50 посадочных мест и общественным туалетом на 10 приборов | 277 066 588 | 27 000 000 | 5 622 178 | Возмещение затрат УКС Мингорисполкома в размере 27 505 071 бел. руб. |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **25 января 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 19 января 2011 г.)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов для участия в аукционе начинается с 10.00 28 декабря 2010 г. и заканчивается в 17.00 19 января 2011 г. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 227 40 22, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

# «НАШЫ МУЖЧЫНЫ І КАРОВУ ПАДОЯЦЦЬ, І ПЕЛЬМЕНЯЎ НАЛЕПЯЦЬ»

**Як толькі карэспандэнт «Звязды» дазналася, што сем'і з Капыльшчыны ўжо другі год запар заваёўваюць на рэспубліканскім конкурсе тытул «Валадар сяла», яна адразу ж ногі ў рукі — і туды. Цікава ж, якія яны, сапраўдныя валадары, — тыя, на каго трэба раўняцца?**

### Пыкі дахадзіліся, Калыханы датанцаваліся

**— Як вы пазнаёміліся з будучым мужам? — цікаўлюся ў Святланы.**

— Ды як раней знаёміліся? (*усміхаецца*). У клубе, на вясковай дыскатэцы. Вялікдзень быў якраз. З таго дня Віця — а ён жыў у суседняй вёсцы — часта да мяне стаў захаджваць. Хадзіў-хадзіў... Вось і дахадзіўся.

— Калі вы дахадзіліся, значыць, мы датанцаваліся, — падхоплівае Яна, пазіраючы на мужа. — Я з бацькамі пераехала ў Капыльскі раён з Сімферопаля. Хадзіла тут у школу, у дзясяты клас. Пазнаёміліся з Ігарам таксама на дыскатэцы. Але адразу ён мне не спадабаўся. Я яму, пэўна, таксама (*смяюцца*). Між тым, хоць цёплых адносін паміж намі не было, але павольныя танцы танцавалі. Вось і датанцаваліся.

**— Вы ўжо разам, пэўна, не адзін пуд солі з'елі. Можаце сказаць, хто ў вашым доме гаспадар, за кім застаецца апошняе слова?**

— Адзін тыдзень я, другі — Яна, — смяецца Ігар.

— У асноўным, усе праблемы ў нас вырашаюцца разам. Але я б сказала, што лідарства ў нашай сям'і ўсё ж такі за мной, — не пагаджаецца Яна. — Калі Ігар сказаў «не», то я магу скарыстаць сваё жаноцкае абаянне і зрабіць так, каб муж змяніў сваё рашэнне. Недарэмна кажуць, што муж — галава, а жонка — шыя. Куды шыя паверне, туды галава і глядзіць.

— А я шыю мужу аддам, — не раздумваючы, кажа Святлана. — Але незамужнім дзяўчатам на заметку: перш чым аддаваць лідарства мужу, трэба выхаваць яго для сябе, перакласці на свой капыл. Бо не сакрэт, што гатовы муж на дарозе не валяецца.

### «Мой муж доіць карову кожную раніцу»

**— Няўжо ніколі не хацелася пераехаць жыць у горад?**

— Ніколі не думалі пра гэта, — паціскае плячыма Святлана.

— А нам хацелася, — кажа Яна. — У Душаве мы жылі ў людскім доме, які нам калгас абяцаў выкупіць. Але так сталася, што старшыня памяняўся, і перад намі стаяў выбар: выкупіць самім той дом альбо набыць жыллё ў Капылі. Колькі дзён ездзілі па горадзе і прыглядалі прыдатны дамок. І, ведаеце, злавілі сябе на думцы, што для нас абодвух галоўнае, каб побач з домам была зямля ды хлявчук. Вось муж і кажа: «Слухай, а ці варта ехаць у Капыль, калі можна жыць у Душаве, непадалёку ад горада, і трымаць паўнавартасную гаспадарку». Адным словам, не можам мы без жыўнасці, таму, пэўна, і дагэтуль жывём у вёсцы.

**— Зараз вясковая моладзь, у сваёй большасці, не рвецца трымаць гаспадарку: мауляў, малако і мяса можна ж у краме набыць.**




## «ВАЛАДАРЫ СЯЛА - 2009»

### Сям'я Пыкаў з вёскі Папоўцы

Віктар працуе ў прыватнай фірме трактарыстам, Святлана — начной нянечкай у дзіцячым інтэрнаце. Сям'я трымае карову, свіней, курэй, качак і нават пчальнік. Таму не дзіўна, што ў мёдзе сям'я Пыка недахопу не адчувае, а фірменнымі стравамі Святланы з'яўляюцца качка з яблыкамі ды бекон з грыбамі. А ў прыгатаванні дзічыны ёй дык і наогул роўных няма. А як жа па-іншаму: муж — першы на вёсцы паляўнічы. Адным словам, на стале ў Пыкаў пуста не бывае, так што такой гаспадыні новы халадзільнік — галоўны прыз конкурсу — прыйшоўся якраз да месца. Віктар і Святлана маюць дзвюх дачок. 12-гадовая Ксенія і 11-гадовая Вольга радуюць бацькоў добрымі адзнакамі і захапляюцца вышыўкай.

#### Свініна ў беконе з грыбамі ад сям'і Пыкаў

***800 грамаў свінога філе, 200 г. нарэзанага тонкімі палоскамі бекону (грудзінкі), 2 галоўкі цыбулі, 350 г шампіньёнаў, 3 сталовыя лыжкі сметанковага масла, невялікі пучок пятрушкі, 2 апельсіны, соль, перац на смак.***

Свіное філе вымыць, абсушыць і парэзаць. Кожны кавалак свініны пасаліць, паперчыць, завярнуць у палоску бекону і замацаваць шпажкамі. Атрыманыя рулецікі выкласці на патэльню з разагрэтым маслам і смажыць 10 хвілін, пастаянна пераварочваючы. Затым уліць паўшклянкі вады і давесці да кіпення. Абсмажаныя рулецікі выкласці на бляху, паставіць у разагрэтую да 200 °С духоўку на 5-7 хвілін. Цыбулю і грыбы абсмажыць у патэльні з разагрэтым маслам да гатоўнасці. Пятрушку вымыць, здрабніць і дадаць да грыбоў. Апельсіны вымыць, нарэзаць кружочкамі і выкласці на талерку. Затым выкласці гатовыя рулецікі, а зверху — цыбульна-грыбную масу.

— Ды я, шчыра прызнацца, і не ўяўляю, як бы мы жылі ў вёсцы ды без гаспадаркі, — кажа Святлана. — Малако, сыр, смятана, тварог, мяса — усё сваё. Глядзіш, а ўсё ж нейкая падтрымка. Малако здаю — вось вам і дадатак да зарплаты. Я лічу, што выгадна трымаць гаспадарку. А што цяжка, дык мы ж да працы звыклыя (*усміхаецца*).

— Ды і не сакрэт, — дадае Яна, — што сваё заўсёды больш карыснае і праверанае, чым купленае.

**— А акрамя каровы ды свіней, якую яшчэ жыўнасць трымаеце?**

— Качкі, куры, трусы... — пералічвае Яна.

— А ў нас ужо трусоў няма, — кажа Святлана. — Але, нягледзячы на гэта, у навагоднім меню значыцца зайчаціна. Муж — ён жа ў нас заўзяты паляўнічы — ужо атрымаў заданне ад дачок.

**— Света, а дзе ж ваш лісіны каўнер? — жартую.**

— Дык лісіца не ў модзе цяпер. Вось раней Віця, калі яшчэ быў халасты, спецыяльна для будучай жонкі прыпас лісіную шкурку. Вось такі ў мяне, дзяўчаты, падарунак быў на вяселле (*смяецца*). Праўда, так і не выпала хадзіць у лісіным футры, усё неяк рукі не даходзілі. А пасля мода змянілася. Дык я з яе дзецям навагоднія касцюмы зрабіла.

**— Ці дзеліце вы абавязкі на выключна «мужчынскія» і «жаночыя»?**

— Не. Калі я позна вяртаюся з працы, то ведаю, што вячэра ўжо прыгатаваная і гаспадарка спраўленая. І, наадварот, калі Ігар затрымліваецца, то ўсё, што ў маіх сілах, раблю сама, а дзеці дапамагаюць.

— У нас тое ж самае, — кажа Святлана. — Адзін аднаго замяняем. Я раблю ў начную змену, таму раніцай Віцю даводзіцца даіць карову.

— Мой Ігар таксама раней, калі мне з дзецьмі трэба было ляжаць у бальніцы, даіў кароў — мы тады дзвюх трымалі. А што рабіць?

— Дзявацца ж няма куды. Карову здаваць? Не, не будзем, — дадае Святлана. — Нашы мужчыны разумеюць, што карова патрэбная.

— Суседзяў прасіць? Дык, паверце, ніхто моцна не жадае даіць чужых кароў, ды і не факт, што карова дасца незнаёмаму чалавеку. Магчыма, мужчыны і не даілі кароў, калі б не было ў гэтым неабходнасці.

— Калі б не было каровы, дык і не даіў бы, — працягвае жартаваць муж Яны.

### «У нядзелю ўсёй сям'ёй лепім пельмені»

**— А чым займаецеся ў вольны час, як праводзіце выхадныя?**

— Той, хто жыве ў вёсцы, пацвердзіць, што вольнага часу за працай тут практычна не бывае. Але мы прылаўчыліся сумяшчаць прыемнае з карысным. Я вялікая аматарка рыбалкі: люблю лавіць рыбу нават больш, чым Ігар. Летам, калі выпадае наша чарга пасвіць кароў, бяром разам з пугамі з сабой вуды і ловім рыбу ў возеры побач з пашай.

**— І які ўлоў быў самым багатым?**

— Там клююць толькі маленькія карасікі. Наш рэкорд — 350 штук у дзве вудачкі.

**— Яна з Ігарам ловяць рыбу разам. А вы, Святлана, свайго Віктара не раўнуеце да хобі?**

— Я нічога не маю супраць таго, што муж ходзіць на паляванне. Не ўвесь жа час хадзіць з працы дадому, не займацца ж увесь час гаспадаркай. Адно і тое ж надакучвае. Трэба, каб было захапленне ў чалавека. Сама ж я люблю вязаць. Раней дык і людзям, калі што прасілі, вязала. А зараз за недахопам часу толькі для сябе паспяваю: шкарпэткі, рукавічкі, дзецям кофтачкі.

**— А ці ёсць у вашых сем'ях нейкія традыцыі?**

— У нас дома ёсць руская печка, у якой я па вялікіх святах што-небудзь запякаю, — кажа Святлана. — Больш за ўсё мае хатнія любяць качку з яблыкамі ды свініну з грыбамі.

— Мы больш за ўсё чакаем Новы год і Вялікдзень. На гэтыя святы грошай не шкадуем. Усе рыхтуем адно аднаму падарункі і кладзём пад ёлку з лістамі ад Дзеда Мароза. У апошні ж тыдзень паста мы стараемся не есці мяса і не ўключаць тэлевізар. Я лічу, што дзецям трэба тлумачыць, чаму трэба рабіць так, а не інакш, прынамсі так выхоўвалі нас нашы бацькі. За што мы ім вельмі ўдзячныя. А на выхадных мы ўсе, як адзін, прымаем удзел у прыгатаванні пельменяў альбо чабурэкаў. Саша раскатвае цеста, сынуля кладзе фарш, а мы з татачкам лепім. Дарэчы, Ігар выдатна гатуе, ён яшчэ да арміі вучыўся на кухара.

**— А па гаспадарцы дзеці дапамагаюць?**

— Больш па дому, — кажа Святлана. — Папыласосіць, падлогу працерці, свае рэчы ў парадак прывесці. Летам агарод дапамагаюць палоць. Сёлета бульбу палолі нараўне са мной.

— А нашы па гаспадарцы дапамагаюць. Летам, пакуль я на працы, сынуля сустракае карову і прывязвае, а Саша садзіцца і доіць. Што тычыцца куранят ды трусоў, дык мы з Ігарам наогул не ўмешваемся. Гэта выключна іх гадаванцы. Віталік любіць парасятак, яго нават прасіць не трэба: сам ходзіць і збірае ім траву. І агарод у нас таксама полецца. Калі Саша тры радкі часнаку атрымае, то сын — радочак. Так павінна быць. Каб выжыць у сельскай мясцовасці, дзеці павінны быць прывучаныя да працы з дзяцінства. Я не кажу, што яны павінны працаваць дзень і ноч. Але ж, згадзіцеся, прапалоць радок часнаку ў дзень — гэта не нагрузка. І посуд у нас Віталік мые з задавальненнем, ды так, што не прыдзярэшся.

### «Мы, хоць і калгаснікі, але не лыкам шыты»

**— Як змянілася ваша жыццё пасля таго, як сталі «Валадарамі сяла»?**

— Дома перасталі бензапілой дровы рэзаць, ручной пілуем, — жартуе Ігар, узгадваючы нядаўні конкурс.

— А калі сур'ёзна, — дадае Яна, — то дадалося ўпэўненасці ў сабе, сваіх сілах. У першую чаргу даказалі сабе, што мы, хоць і калгаснікі, але не лыкам шыты (*смяюцца*). Добра, што праходзяць такія конкурсы.

— На конкурсе мы пазнаёміліся з сем'ямі з суседніх вёсак, ды так пасябравалі, што разам у каго-небудзь збіраемся на святы. Жыць стала весялей. Прыемна і тое, што пасля перамогі нас раён пачаў запрашаць на розныя мерапрыемствы: злёт перадавікоў, злёт маці... А дачок, калі аддавалі ў Капыльскую гімназію, дырэктар так і прадставіў дзецям: «Да нас прыйшлі вучыцца валадары сяла» (*смяюцца*).

**— Света раскажы, а як вашы парасяты (за першае месца «на вобласці» сем'ям далі па пары парасят), з'елі ўжо? — цікавіцца Яна.**

— Нашы захварэлі і памерлі. А вашы як?

— Растуць. Прывезлі дадому маленькіх, кілаграмаў па 6. Зараз ужо па 25 кілаграмаў будуць. Мы іх назвалі Шпунцік і Фунцік. Прыходжу ў хлеў — і настрой уздымаецца, бо падарунак навявае прыемныя ўспаміны пра конкурс.

**Надзея ДРЫЛА,** *Капыльскі раён.*

### Даведка «Звязды»

**Упершыню конкурс для сельскай моладзі «Валадар сяла» стартаваў чатыры гады таму ў Глыбоцкім раёне. Яркі і відовішчны, ён адразу ж прыцягнуў увагу грамадскасці. З 2008 года праводзіцца Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, з 2009-га праходзіць пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і ААТ «Белаграпрамбанк». Колькасць удзельнікаў праекта пастаянна расце. Толькі сёлета за тытул «Валадар сяла» на розных этапах конкурсу спаборнічалі 950 маладых сем'яў. Як адзначыла Наталля Гарбацэвіч, першы сакратар Капыльскага раённага камітэта ГА «БРСМ», конкурс праводзіцца, каб павысіць інтарэс маладых сем'яў да жыцця на сяле, падняць прэстыж сельскагаспадарчых прафесій і ўмацаваць сямейныя традыцыі. Змагацца ж за званне «Валадар сяла» могуць муж і жонка ва ўзросце да 35 гадоў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і маюць аднаго ці больш дзяцей.**



## «ВАЛАДАРЫ СЯЛА - 2010»

### Сям'я Калыханаў з вёскі Душава

Галава сям'і Ігар працуе лесніком у Колаўскім лясніцтве. Яго жонка Яна — мастацкі кіраўнік мясцовага Дома культуры, завочна вучыцца ў Інстытуце культуры ў Мінску. Яна — аматар рыбалкі, на якую ў вольны час ездзіць разам з мужам. Дачка Саша вучыцца ў трэцім класе і займаецца ў музычнай школе па класе фартэпіяна. Пяцігадовы Віталік — першы памочнік бацькам ва ўсім, што звязана з доглядам хатніх гадаванцаў. У садку наведвае танцавальны гурток, куды запісаўся, паводле слоў мамы, каб танцаваць з дзяўчынкай, якая яму падабаецца.

#### Парася, фаршыраванае грэчкай, ад сям'і Калыханаў

**(гатавалі на раённым этапе конкурсу ў рускай печы, але дома, паколькі няма печы, карыстаюцца духоўкай).**

***Тушка малочнага парасяці, соль, спецыі, маянэз, грэчка, алей, цыбуля, морква, лімон, зеляніна.***

Апарце парася, выпатрашыце, натрыце соллю, спецыямі, маянэзам і пакіньце на суткі. Для начынкі зварыце грэчку і астудзіце. Абсмажце моркву з цыбуляй і змяшайце з варанай грэчкай. У начынку для прыемнай кіслінкі можна дадаць лімон, парэзаны на чацвярцінкі. Атрыманым фаршам запоўніце жывоцік парасяці і зашыйце. Змажце алеем фольгу і закруціце ў яе фаршыраванае парася, папярэдне звязаўшы ножкі. Пакладзіце парася на бляху (на спінку) і пастаўце ў разагрэтую духоўку. Праз гадзіны дзве можна вымаць і ўпрыгожваць зелянінай.


Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | | |

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)



Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць эл. чайнік, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 22 студзеня 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 сакавіка 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 11.11.10 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 13.11.10 па 31.03.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1794 ад 03.11.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**7 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________ (аддзяленне сувязі)

____________________ **на I кв. або I–е паўг. 2011 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# «На Міколу мы гулялі цэлы тыдзень!..»





КАЦЯРЫНА Дзмітрыеўна Ярмоленка рыхтавалася да дня святога Мікалая-цудатворца загадзя і сур'ёзна. Ведала, каго запросіць на развітанне са «свячою», хоць у гэты дзень у хату, дзе стаіць Мікольская свечка, можа заходзіць любы чалавек і кожнаму знойдзецца месца за сталом. А стол для гасцей 87-гадовая жыхарка вёскі Чарапы падрыхтавала багаты, нягледзячы на калядны пост. Гэтак было спрадвеку ў Чарапах: на Міколу дазвалялі застольныя «парушэнні». Стол у Кацярыны літаральна ламаўся ад смачнай ежы і бутэлек не толькі з ліманадам. Ды і як у наш час абысціся без чаркі, калі без пляшкі белай ніхто парог не пераступае?!

— Каб было не горш, як у іншых, дзякаваць Богу, не бедныя! — кажа гаспадыня, у хаце якой цэлы год прастаяў абраз святога Мікалая і гарэла Мікольская «свяча». — Хіба не свята, што мы яшчэ жывём, што ўсё добра ў нашых дзяцей! Гэта дзякуючы Міколу!

Але не ў чарцы і шчодрай бяседзе сутнасць вясковай традыцыі спраўляць Міколу. У гэты дзень і «свяча», і абраз павінны быць перанесены ў новы дом, дзе іх годна сустрэнуць і пакінуць на цэлы год. А потым зноў будзе развітанне. Адпаведна традыцыі і магчымасці.

А ТРАДЫЦЫЯ пераносу «свячы» ў Чарапах ад іншых аналагічных беларускіх абрадаў адрозніваецца найперш тым, што пераносяць яе толькі мужчыны. Абавязкова абгорнутую ручніком — каб былі багатыя. Перад вынасам «свячы» з хаты іканастас абвязваюць тканінай — «намёткамі» — гэта абрад абракання, цалуюць абразы і тройчы абносяць іх вакол стала з хлебам. Госці, пакліканыя ў гэты дзень, перад ганкам сыплюць гаспадарам жыта, як галоўны гасцінец. У Чарапах гэтая традыцыя існуе і дагэтуль, нягледзячы на тое, што земляробства для вяскоўцаў-пенсіянераў не мае ранейшай важнасці: хлеб можна купіць у краме. Але па-ранейшаму менавіта хлеб застаецца галоўным сімвалам жыцця і багацця. З хлебам у Чарапах сустракаюць «свячу». І калі пераносяць, другую — гаспадарскую свечку — нясуць менавіта ў бохане хлеба. А выносячы абразы з хаты, сцелюць кажух і тройчы пралазяць пад своеасаблівымі варотамі.



У вёсцы гэтым разам пераносілі не адну, а адразу тры «свячы». Некалі было нават чатыры! Адна з гаспадынь, якая сустракала, — 74-гадовая Палагея Ермалаеўна Ларкова — спявала:

*А хто-хто Мікалая любіць?*
*А хто-хто яму верна служыць?*
*Таму святы Мікалай*
*На ўсякі час памагай!..*

ПАЛАГЕЯ Ермалаеўна прыгадвала, як святкавалі Міколу раней. Вядома, не так багата, як цяпер. Галоўнымі стравамі на святочным стале былі талакно з аўсу, «памазэя» з насення льну, «рэзнікі» — пышкі з вяршкамі, кісель з чырвоных буракоў. Гарэлкі так шмат, як цяпер, не пілі, але весяліліся куды больш. Назаўтра раніцай, пасля пераносу «свячы», гаспадыня, з хаты якой перанеслі, прыносіла Міколу «полудзень». І зноў прыходзілі госці і працягвалі весяліцца і славіць свайго нябеснага апекуна. Ладзілі ігрышчы, гулялі ў «цыганоў» — хадзілі «жабраваць». Усё «нажабраванае» неслі гаспадыні «свячы» і зноў працягвалі свята.

Некалі ў гэты час вясковец адпачываў ад клопатаў пра ўраджай і поле. І зімовы Мікола неўпрыкмет пераходзіў у Каляды. Спраўлялі Міколу нават у вайну. Многія вяскоўцы лічаць, што дзякуючы «свячы» Чарапы не зніклі ў той цяжкі час.

— Просім у Міколы здароўя сабе, дзецям, унукам і праўнукам. І ўсім добрым людзям, — кажуць чарапоўцы. Як полымя свечкі ад ветру, яны берагуць свайго Міколу. Каб ён дапамагаў ім.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Шклоўскі раён.*



Прамая лінія

# МАЛОЧНАЯ ЗАЛОЗА ЛЮБІЦЬ УВАГУ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 21, 22 снежня.)

**На вашы пытанні адказаў загадчык аддзела анкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Леанід ПУТЫРСКІ.**

☎ ***— Бялынічы, Зінаіда Мікалаеўна, 55 гадоў. У 2008 годзе паставілі дыягназ — ліпома малочных залоз. Рыхтавалася да аперацыі, але захварэла, і яе адмянілі. У 2009 дыягназ пацвердзіўся на ультрагуку, аднак разам з тым сказалі, што ёсць і фіброзная мастапатыя. Мне б хацелася зрабіць мамаграфію, але мой мамолаг па месцы жыхарства адмаўляе ў гэтым... Чаму ўсё ж такі замест аднаго ўрэшце атрымалася два дыягназы? Дзе мне можна зрабіць мамаграфічнае даследаванне?***

— Ліпома — пухліна дабраякасная і жыццю не пагражае, хоць любое ўшчыльненне ў малочнай залозе мэтазгодна выдаляць. У рэдкіх выпадках толькі падчас выдалення кістаў ці тых жа ліпом мы выяўляем і пухліну, якая не была выяўлена да аператыўнага ўмяшання. Акрамя таго, ліпома суправаджаецца болевымі адчуваннямі. Што да мастапатыі, то, хутчэй за ўсё, яна была ў вас і раней. Проста гэты дыягназ — даволі суб'ектыўны. Мамолаг і гінеколаг могуць па-рознаму ацэньваць сітуацыю. Пра мастапатыю кажуць звычайна тады, калі яна надта выражаная. У такой сітуацыі і прызначаецца адпаведнае лячэнне.

Я б не пагадзіўся з тым, што не трэба выконваць мамаграфію. Нават пры поўным здароўі малочнай залозы мы рэкамендуем такое даследаванне, каб пераканацца, што там сапраўды няма раку. З другога боку, нельга разлічваць толькі на гэта даследаванне. Палова ўсіх ракаў выяўляецца ў інтэрвалах паміж мамаграмамі. Таму трэба праводзіць яшчэ самаагляд і хадзіць на прыём да ўрача-гінеколага, анколага ці мамолага... Зрабіць мамалагічнае даследаванне вам можна ў Магілёўскай абласной бальніцы, дзе ёсць мамалагічны кабінет. Або можна звярнуцца ў анкалагічны дыспансэр.

☎ ***— Гомельская вобласць, Ірына. Я чытала ў «Звяздзе», што грудное выкормліванне прафілактуе рак малочнай залозы. Цікава, а за кошт чаго гэта магчыма? Мая сяброўка карміла дзіця да чатырох гадоў. Гэта лепш для малочнай залозы, чым кармленне на працягу года?***

— Ёсць звесткі толькі пра тых жанчын, якія не кармілі наогул або кармілі звыш шасці месяцаў. Устаноўлена, што ў першым выпадку павялічваецца рызыка раку малочнай залозы, а ў другім — зніжаецца. Тут трэба мець на ўвазе тое, што любы орган павінен выконваць функцыю, закладзеную прыродай.

***— Наколькі сур'ёзная такая інфекцыя як мастыт?***

— Мастыт — не інфекцыя, а захворванне, якое выклікаецца інфекцыяй. Мастыты могуць быць малымі і праходзіць літаральна пасля першага кампрэса, а бываюць і гнойныя, якія, калі не лячыць, нясуць у сабе пагрозу жыццю жанчыны. Нялечаны або няправільна лечаны мастыт можа выклікаць сэпсіс — заражэнне крыві. Асабліва небяспечныя мастыты, якія развіваюцца падчас груднога кармлення. У літаратуры вядомыя мастыты, якія распаўсюджваюцца на ўсю залозу, выклікаюць гангрэну і патрабуюць выдалення органа. Так што, да любога мастыту трэба ставіцца як да сур'ёзнага захворвання і паказвацца ў першую чаргу хірургу.

***— А ад чаго можа ўзнікнуць такі стан?***

— Малако — вельмі спажыўны асяродак для бактэрый. Хоць мастыт можа ўзнікнуць неабавязкова ў мамы, якая корміць. У любога чалавека скура, у тым ліку малочных залозаў, нестэрыльная.

☎ ***— Бярозаўскі раён, Настасся. Як трапіць да вас на прыём?***

— Можна пазваніць у рэгістратуру па нумары 619 24 63 і запісацца да мяне.

***— Такіх спецыялістаў як мамолагі не хапае. Вы маглі б вынесці прапанову аб тым, каб такіх спецыялістаў стала больш?***

— Сапраўды, у Беларусі такіх спецыялістаў не хапае. У Расіі ўжо дэ-юрэ існуе такая спецыяльнасць як мамалогія. Нашай жа жанчыне сёння прасцей прайсці агляд малочнай залозы ва ўрача-гінеколага. Калі ён нешта западозрыць, то абавязкова накіруе да анколага. А вось анколагі ёсць у кожным раёне. Калі ўжо анколаг нешта вынайдзе, то абавязкова накіруе ў аддзяленне, дзе ёсць мамолаг.

***— Калі рак быў выяўлены на ранняй стадыі, жанчыну пралячылі і ўсё ў яе добра, яна яшчэ можа пасля гэтага нарадзіць? Як можа развівацца сітуацыя ў час цяжарнасці і родаў?***

— Сёння калі жанчына звярнулася да ўрача менавіта на ранняй, першай стадыі, гэта не перашкаджае таму, каб яна стала маці. У нас ёсць выпадкі, калі жанчыны пасля лячэння ранняга раку малочнай залозы станавіліся матулямі, потым бабулямі... Ні цяжарнасць, ні роды не абвастраюць развіццё раку. Хоць у любым выпадку трэба раіцца з урачом.

***— А груднoе кармленне будзе магчымым?***

— Здаровай малочнай залозай, вядома, можна карміць, аперыраванай не ўдасца, паколькі яна перанесла абпраменьванне.

***— Ці ёсць верагоднасць перадачы раку малочнай залозы ў выпадку нараджэння дачкі?***

— Рак не перадаецца праз плацэнту. Аднак ад маці да дачкі можа перадавацца спадчынная схільнасць, што назіраецца ў 5-10 працэнтах выпадкаў. Ужо ў дарослым стане дачка можа здаць адпаведны аналіз крыві і высветліць, ці ёсць у яе змяненні, мутацыі ў некаторых генах, якія могуць прывесці да раку малочнай залозы.

☎ ***— Ашмяны, Аксана. 44 гады. Што азначае дыягназ фіброзныя кісты? Якім чынам лепей за ўсё іх пазбаўляцца?***

— Такога дыягназу — фіброзныя кісты — няма, а ёсць фіброзна-кістозная мастапатыя. Гэта абменныя змяненні ў малочнай залозе. Утвараецца больш фіброзных тканак, і сярод іх у пратоках могуць утварацца кісты. Калі яны існуюць доўгі час, то могуць ушчыльняцца іх сценкі, і тады іх выдаляюць. Проста пункцыя тут не ўратуе, бо ў шчыльных сценках зноў і зноў будзе збірацца вадкасць. Звычайна ж кісты з мяккімі сценкамі выдаляюцца з дапамогай пункцый. Калі пасля гэтага даследаванне пакажа, што ўсё ў парадку, то прызначаецца толькі кансерватыўнае, медыкаментознае лячэнне. Калі ж кіста напаўняецца, то яе абавязкова трэба выдаляць хірургічным шляхам.

☎ ***— Аршанскі раён, Кацярына. Ці павышае такое захворванне як фібраадэнома рызыку развіцця раку ў будучыні? Па якой прычыне ўзнікае гэта захворванне?***

— Сама фібраадэнома не павышае рызыку развіцця раку, але яна можа ператварацца і ў рак, і ў саркому, таму, як правіла, іх своечасова выдаляюць. Выдаленая ж яна не выкліча рак. Але яе наяўнасць сведчыць пра тое, што ў арганізме ідуць змяненні, якія могуць выклікаць і рак. У статыстычных матэрыялах адзначаецца, што жанчыны з вялікай колькасцю фібраадэном маюць большую рызыку раку малочнай залозы.

☎ ***— Мінск, Вера. Наколькі сур'ёзна трэба ставіцца да ўшчыльнення ў малочнай залозе? Колькі часу — тыдняў, месяцаў — можна чакаць, пакуль сітуацыя вернецца ў норму?***

— У жанчыны, якая сама выявіла ў сябе ўшчыльненне ў малочнай залозе, ёсць час выключна на тое, каб адшукаць добрага ўрача, і пошук трэба пачаць у той жа дзень. Наяўнасць ушчыльнення прымушае жанчыну думаць пра самае дрэннае, але ніколі не трэба самой выстаўляць сабе дыягназ. 95 працэнтаў праблем малочнай залозы не звязаныя з захворваннем на рак. Таму ў першую чаргу варта думаць, што ў вас усё будзе добра і ніякага раку няма, а па-другое, трэба як мага хутчэй звярнуцца да ўрача. На гэта ёсць дзве прычыны: калі ўсё ж такі мае быць рак, то чым раней пачнецца лячэнне, тым вышэй шанцы дасягнуць станоўчага выніку. Па-другое, калі жанчына будзе адцягваць візіт да ўрача, яна ўсё роўна не пазбавіцца трывожных думак. Не трэба нічога баяцца. Фактычна кожная трэцяя жанчына ў нас сёння аперыруецца з захаваннем малочных залозаў.

☎ ***— Маладзечна, Вольга. 31 год. Ці праўда, што ў некаторых участках малочнай залозы рак развіваецца часцей, чым у іншых?***

— Абследаванне малочных залозаў лепш за ўсё праводзіць у першыя дзесяць дзён менструальнага цыклу. Калі месячных ужо няма, тады ў адны і тыя ж дні ранейшага цыклу — на пачатку ці напрыканцы. Таму што месячных можа і не быць, а вось яечнікі будуць працаваць, і малочная залоза можа рэагаваць на гэта.

Для самааглядку станьце з агаленай залозай перад люстэркам, візуальна ацаніце памер грудзей, скуру, саскі. Памер павінен быць прыкладна аднолькавым, хоць у 40 працэнтаў жанчын адна малочная залоза крыху большая. Калі ж раптам заўважаецца павелічэнне на адзін-два памеры за два тыдні, трэба тэрмінова паказвацца ўрачу... Далей кругавымі рухамі глядзім падпахавыя ямкі. Там не павінна быць ніякіх «гарошын», «вішань» і г.д. Малочныя залозы трэба аглядаць зверху ўніз, кругавымі рухамі. Ніякіх змяненняў у мяккай тканцы быць не павінна. Трэба разумець, што самабследаванне ратуе не ад захворвання, а ад запушчанасці. Запушчаныя выпадкі лечацца вельмі цяжка і вельмі дорага як для дзяржавы, так і для жанчыны. А раннія стадыі лечацца добра. Таму раз у год да 40 гадоў і раз у паўгода пасля 40 гадоў жанчына павінна паказвацца доктару...

Аглядаць трэба ўсю малочную залозу, хоць, сапраўды, рак часцей за ўсё лакалізуецца ў верхнім вонкавым квадрацы. Можа быць, з-за таго, што праз гэты аддзел ідзе асноўны адток лімфы, можа быць, таму, што галоўным чынам на гэтую частку прыпадаюць траўмы. Але ніхто не ведае, дзе менавіта рак з'явіцца, і таму правяраць трэба ўсю залозу, а не адзін аддзел.

***— Пра што можа сведчыць павелічэнне лімфатычных вузлоў у падпахавай ямцы?***

— Павялічаныя лімфавузлы — неабавязкова адразу рак. Яны могуць сведчыць пра некаторыя іншыя хваробы, паколькі лімфавузлы змагаюцца з любой інфекцыяй, напрыклад, грыпам, нават грыбковай інфекцыяй. Але бывае так, што пухліна яшчэ ніяк пра сябе не заяўляе, яе немагчыма выявіць рукамі, не бачна ні на ўльтрагуку, ні на мамаграме, а лімфавузлы ўжо адрэагавалі, і мы разумеем, што пухліна ў залозе ёсць. У большасці выпадкаў пухліна ўсё ж такі выяўляецца, але бывае і так, што не выяўляецца. Пры такіх акультных формах раку мы мяркуем, што недзе ён мае быць, і лечым як рак малочнай залозы.

Бывае і так, што пухліна ў малочнай залозе ёсць, аднак лімфавузлы не павялічаны. Метастазы ў падпахавую ямку могуць даваць любыя органы, напрыклад, шчытападобная залоза, лор-органы, страўнік, лёгкія. Хоць у 90 працэнтах выпадкаў размова ідзе пра рак малочнай залозы.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

*(Працяг будзе.)*

Краіна здароўя

Выпуск № 67 (236)

## БУРАКІ І БУЛЬБА — СУПРАЦЬ ТАКСІНАЎ І КАНЦЭРАГЕНАЎ

**Малако за шкоднасць атрымліваюць прадстаўнікі многіх прафесій. Аднак ёсць меркаванне, што наўрад ці гэты прадукт можа нейтралізаваць усе яды і таксіны, якія трапляюць у арганізм людзей, занятых на шкоднай вытворчасці.**

Даследчыкі сцвярджаюць, што абясшкодзіць таксічныя спалучэнні можна з дапамогай спецыяльнай дыеты. Здольнасцю інактываваць шкодныя рэчывы і выводзіць іх з арганізма валодае марская капуста. Яе лісце на 5 працэнтаў складаецца з солей альгінавай кіслаты, якія называюць прыроднымі ўтылізатарамі шкодных рэчываў. Альгіны звязваюць некаторыя хімічна-актыўныя спалучэнні, а таксама солі цяжкіх металаў. Яны пераходзяць у інертны стан і ўжо не могуць нанесці здароўю ніякай шкоды.

Нейтралізаваць шкодныя рэчывы дапамагае таксама клятчатка, якая ўтрымліваецца ў гародніне і садавіне. У гэтым сэнсе сапраўды ўнікальнымі ўласцівасцямі валодаюць буракі, якія ўтрымліваюць флаваніды. Флаваніды звязваюцца з цяжкімі металамі, а інертныя спалучэнні, што ўтвараюцца ў выніку такой рэакцыі, хутка выводзяцца з арганізма. Да ўсяго іншага буракі валодаюць антыбактэрыяльнай актыўнасцю. Яны абеззаражваюць некаторыя таксіны, што выпрацоўваюцца небяспечнымі мікробамі.

І, нарэшце, не менш карысная можа аказацца бульба, звараная ў шалупіні. Крухмал, які ўтрымліваецца ў бульбе, не пераварваецца ў кішэчніку. Ён па сваёй структуры нагадвае сетку, у якую і трапляюць малекулы розных шкодных спалучэнняў — ад нітратаў да канцэрагенаў. Такім чынам, вараная бульба можа быць найкаштоўнейшым прадуктам для прадстаўнікоў «шкодных» прафесій: хімікаў, фармацэўтаў, шкловыдзімальнікаў, маляроў, анестэзіёлагаў, вадзіцеляў і паставых ДАІ. Апошнія вымушаны штодня ўдыхаць загазаванае паветра, якое ўтрымлівае ў сабе цяжкія металы і таксічныя лятучыя спалучэнні, шкодныя для здароўя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Аптэка

## Даступныя лекі — эфектыўныя лекі?

**Няякасных лекавых прэпаратаў у Беларусі быць не можа. Гэта афіцыйная пазіцыя айчынных вытворцаў лекаў і Міністэрства аховы здароўя. Апошняе праводзіць цэлы шэраг сур'ёзных праверак на якасць усіх прэпаратаў, якія прапануюцца насельніцтву.**

Для забеспячэння якасці прэпарата вытворчасць лекавых сродкаў павінна адпавядаць патрабаванням стандарту GMP. Першым фармацэўтычным прадпрыемствам Беларусі, якое атрымала нацыянальны сертыфікат GMP (належнай вытворчай практыкі) на ўсе лекавыя прэпараты і на поўны цыкл вытворчасці, стала беларуска-балгарская кампанія «Лекфарм». Прэпараты кампаніі — джэнерыкі, лекі, аналагічныя арыгінальным прэпаратам па складзе актыўных рэчываў, механізме дзеяння і эфектыўнасці. Выпускаюцца яны па такой жа тэхналогіі, што і брэндавыя прэпараты, але іншымі вытворцамі. Чаму джэнерыкі больш танныя? Справа ў тым, што распрацоўка, іспыты і сертыфікацыя новага лекавага сродку займае ў кампаній дзясяткі гадоў і каштуе мільёны долараў. Каб акупіць падобныя расходы, кошт прэпаратаў застаецца досыць высокім.

Вытворцы дапускаюць, што прэпараты не могуць быць больш ці менш якаснымі, але могуць быць больш ці менш эфектыўнымі. І гэта звязана яшчэ з адным важным крытэрыем — даступнасцю, што нельга недаацэньваць, калі размова заходзіць пра лячэнне, скажам, артэрыяльнай гіпертаніі.

— Кожны дыстрыб'ютар, кожная аптэка можа ўстанавіць свой кошт на імпартныя лекі, паколькі ў шэрагу краін падобнае рэгуляванне кошту не дзейнічае, — тлумачыць цэнавую палітыку **намеснік начальніка аддзела маркетынгу СТАА «Лекфарм» Юрый ГРЫГОР'ЕЎ**. — Нашы прэпараты ва ўсіх аптэках маюць амаль адзін і той жа кошт. Дзяржава, як вядома, рэгулюе працэнт нацэнкі на ўсе беларускія прэпараты. Да 30-40 працэнтаў ад кошту прэпарата прыпадае на дыстрыб'ютарскую і аптэчную сетку. Што да сабекошту прэпарата, то ён залежыць ад кошту асноўных інгрэдыентаў, дапаможных рэчываў, плюс сама вытворчасць, праца людзей, затраты на маркетынг, утрыманне прадпрыемства, прыбытак і г.д.

У ліку нашых прэпаратаў ёсць рэнтабельныя, а ёсць нізкарэнтабельныя, паколькі мы выконваем яшчэ сацыяльную функцыю, пастаўляем такія прэпараты, як эналапрыл, неабходны малазабяспечаным грамадзянам. Пашырэнне асартыменту прэпаратаў і даступны кошт пры высокай якасці зніжае залежнасць ад закупкі імпарту і вымушае вытворцаў паніжаць кошт на сваю прадукцыю...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

На заметку

## ШТО РАБІЦЬ ПРЫ АБМАРАЖЭННІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Паніжаная тэмпература паветра — асноўная прычына абмаражэння. Аднак рызыка не зніжаецца нават пры нулі градусаў. Моцны вецер, павышаная вільготнасць паветра, прамоклае адзенне і абутак значна ўзмацняюць страту цяпла арганізмам.**

Часцей за ўсё церпяць адкрытыя ўчасткі цела: нос, вушы, шчокі, падбародак і пальцы рук. Першыя прыкметы абмаражэння распазнаюцца не адразу. Узнікае лёгкае смыленне і паколванне, якое часта не ўспрымаецца ўсур'ёз, паколькі гэтыя сімптомы рэзкага дыскамфорту не прыносяць і хутка знікаюць.

Ружовы румянец на шчоках падчас рухальнай актыўнасці — гэта нармальна. Скура чырванее, бо сасуды пашыраюцца і прыток крыві да тканак узмацняецца. А вось калі на змену пачырваненню прыходзіць бледнасць, гэта ўжо яўны сімптом абмаражэння. Адразу вызначыць цяжкасць абмаражэння дастаткова складана. Бо толькі пасля саграванння ў вобласці пашкоджаных участкаў узнікае боль, з'яўляюцца ацёкі і вадыры на скуры. Чым пазней праяўляюцца гэтыя прыкметы, тым большая верагоднасць пашкоджання глыбокіх тканак.

Пры холадавай траўме дарагая кожная хвіліна. Таму як мага хутчэй зайдзіце ў цёплы пакой, каб сагрэць абмарожаныя ўчасткі і аднавіць у іх кровазварот. Катэгарычна пры гэтым забаронена выкарыстоўваць сухое цяпло. Самы просты і эфектыўны спосаб — гэта саграванне ў цёплай вадзе. Мясцовыя ванны робяць пры абмаражэнні ног і рук. Пачатковая тэмпература вады павінна быць 36-37 градусаў, потым яе паступова павышаюць да 40 градусаў. Улічваючы, што ванну трэба прымаць не менш 30 хвілін, вам не раз давядзецца падліваць гарачую ваду. Калі пры саграванні з'явіўся боль і пачырванела скура, значыць, вашы намаганні не прайшлі дарма — кровазварот аднавіўся. Замацаваць поспех дапаможа лёгкі масаж, які можна рабіць прама ў вадзе. Пачынаць расціранні трэба з кончыкаў пальцаў, паступова рухаючыся ўгору. Пасля ванны накладваюць сагравальныя павязкі з некалькіх слаёў марлі і тоўстага слою ваты, якія зверху прыкрываюць цэлафанам. Абмарожаныя пальцы трэба абавязкова перакласці палоскамі бінту. Такімі ж цеплаізаляцыйнымі павязкамі саграваюць вушы, нос і шчокі. Пры лёгкім абмаражэнні вынік павінен з'явіцца на працягу першых 10-20 хвілін. Калі нічога не мяняецца, выклікайце «хуткую дапамогу». Да прыезду ўрачоў не рабіце рэзкіх рухаў канечнасцямі. Руку можна падвесіць з дапамогай хусткі ці шаліка, а ногі пажадана пакласці так, каб яны былі крыху апушчаныя ўніз.

**Засцерагчы сябе ад абмаражэнняў дапаможа захаванне наступных правілаў:**

**1.** На мароз выходзьце ў шматслойным адзенні. Праслойкі паветра паміж тканінай выдатна ўтрымліваюць цяпло. Адмоўцеся на час ад металічных упрыгажэнняў.

**2.** Змажце твар і рукі спецыяльным тлустым (а не звычайным увільгатняльным!) крэмам. А вось спіртавымі ласьёнамі карыстацца не рэкамендуецца.

**3.** Не гуляйце на галодны страўнік.

**4.** Калі адчуеце, што пачынаеце замярзаць, парухайцеся.

**5.** Не расцірайце твар рукавіцай, толькі сухой далонню, а лепей папрактыкавацца ў грымасніčанні: усміхайцеся, моршчыце нос.

**6.** Пасля таго, як моцна змерзнеце, будзьце ўважлівыя, трапіўшы нарэшце ў цёплае месца: у транспарце старайцеся сесці, бо часта працэс сагравання суправаджаецца моцнымі болевымі адчуваннямі і галавакружэннем аж да страты прытомнасці.

**7.** Не курыце на марозе. Нават адна цыгарэта выклікае спазм капіляраў канечнасцяў, які цягнецца некалькі гадзін, а гэта магчымы шлях да абмаражэння.

**8.** Не варта і выпіваць на вуліцы. Алкаголь пашырае сасуды, што павялічвае цеплааддачу і садзейнічае пераахаладжэнню.

**Чаго нельга рабіць пры абмаражэнні?**

Правілы простыя: не расцірайце пабялелую скуру снегам. Ён не толькі лёгка траўмуе яе, але і здольны вас інфіцыраваць; калі мяркуеце выйсці на вуліцу падчас халадоў, не ўжывайце спіртное, а вось калі замерзлі і ўжо знаходзіцеся ў цяпле — чарка каньяку не будзе лішняй. Перад выхадам на мароз не забудзьцеся перакусіць лёгкай, але каларыйнай стравай.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

### ПЯЦЁРА СПАЛІ, НЕ ПАДАЗРАЮЧЫ ПРА ПАЖАР

**Пажар пачаўся ў Мар'інай Горцы Пухавіцкага раёна глыбокай ноччу. На шчасце, яго заўважыла суседка, якую разбудзіў гук шыферу, што трашчаў.**

На той момант агонь ужо ахапіў дах, а дым запоўніў дом. Прыбыўшыя праз тры хвіліны выратавальнікі першай справай пачалі шукаць людзей. З дому вынеслі пяць чалавек: састарэлую гаспадыню, яе сына і трох знаёмых сына. Яны спакойна спалі і нават не падазравалі, што творыцца навокал. Людзі не пацярпелі, у шпіталізацыі не было патрэбы.

### ПАРАНІЎ КАЛЕГУ-ПАЛЯЎНІЧАГА Ў НАГУ

**Такі выпадак адбыўся пры правядзенні калектыўнага палявання ў паляўнічых угоддзях Дзятлаўскай раённай структуры «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў».**

Мясцовы паляўнічы, майстар па нарыхтоўцы лесу ў Дзятлаўскім РУП ЖКГ, падышоў да месца збору паляўнічых з зараджанай карцеччу паляўнічай стрэльбай. А калі паспрабаваў дастаць патрон з канала ствала, то выпадкова націснуў на спускавы курок. Адбыўся стрэл — і зарад карцечы патрапіў у нагу іншаму паляўнічаму, вадзіцелю ААТ «Дварэцкі льнозавод», што стаяў побач. Па факце няшчаснага выпадку на паляванні Дзятлаўскім РАУС у распачынанні крымінальнай справы адмоўлена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### СПРАВЫ САРДЭЧНЫЯ — КЛОПАТ ДЗЯРЖАЎНЫ

**Да 500 аперацый на адкрытым сэрцы змогуць праводзіць спецыялісты Гомельскага абласнога клінічнага кардыяхірургічнага дыспансэра ў новым аперацыйна-рэанімацыйным блоку, які толькі што адкрыўся ва ўстанове аховы здароўя. Яго будаўніцтва было распачата ў 2008 годзе, расказала галоўны ўрач установы аховы здароўя Ганна Лапаціна. Узвядзенне ажыццяўлялася за кошт сродкаў, выдзеленых медыцынскай установе на бязвыплатнай аснове ўрадам Кітая, а таксама з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў.**

Галоўнымі ў новым трохпавярховым будынку стануць дзве кардыяхірургічныя аперацыйныя, аснашчаныя самым сучасным медыцынскім абсталяваннем. Тут функцыянуе ўнікальная сістэма вентыляцыі, якая дазваляе папярэджваць інфекцыйныя ўскладненні, а таксама сістэмы асвятлення і маніторынгу пацыентаў. У новым блоку кардыяхірургічнага дыспансэра ёсць аддзяленне рэанімацыі на 6 ложкаў для выходжвання пацыентаў пасля кардыяхірургічных аперацый, а ў аперацыйна-рэанімацыйным модулі размясціліся неабходныя памяшканні для медперсаналу. Хваробы сістэмы кровазвароту лідзіруюць у структуры смяротнасці і інваліднасці сярод насельніцтва Гомельскай вобласці і рэспублікі. Укараненне новых тэхналогій дазволіць палепшыць якасць і павялічыць працягласць жыцця людзей. Штогод кардыяхірургі рэгіёна праводзяць да 270 аперацый на адкрытым сэрцы. З адкрыццём новага аперацыйна-рэанімацыйнага блока іх колькасць узрасце ўдвая, а ў перспектыве — да тысячы ў год.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Элемент жыцця

# ВІТАМІН К ВАРТЫ ЎВАГІ!

**Шпінат, капуста, бурачнік, салата-латук... Акрамя колеру, усе гэтыя зялёныя дары прыроды аб'ядноўвае яшчэ адна дэталь. Яны адносяцца да прадуктаў, у якіх у вялікай колькасці ўтрымліваецца вельмі каштоўны інгрэдыент — вітамін К. Чаму ж пра гэтага абаронцу крыві, скуры, касцей і нырак успамінаюць значна радзей, чым пра іншых яго «калег» — A, B, C, D?**

Вітамін К — тлушчарастваральны. Фактычна гэты вітамін — цэлая група рэчываў з аднолькавымі або падобнымі ўласцівасцямі. Хоць звычайна маюць на ўвазе вітамін $K_1$, які сінтэзуецца раслінамі, і вітамін $K_2$, які выпрацоўваецца мікраарганізмамі ў тоўстым кішэчніку чалавека, а таксама клеткамі печані жывёлы.

**Асноўная функцыя вітаміну К** у арганізме — забеспячэнне нармальнага згусання крыві (каагуляцыі). Ён неабходны для ўтварэння пратрамбіну — хімічнага злучэння, якое сінтэзуецца печанню і садзейнічае фарміраванню крывяных згусткаў.

Вітамін К таксама павышае трываласць сасудзістых сценак, удзельнічае ў энергетычных працэсах, нармалізуе рухальную функцыю страўнікава-кішачнага тракта і работу мышцаў. Акрамя таго, гэты вітамін неабходны для ўтрымання кальцыю ў складзе касцявой тканкі.

Для людзей, якія актыўна займаюцца спортам, вітамін К асабліва важны, паколькі зніжае рызыку кровастратаў пры траўмах і ўзмацняе скарачэнні мышцаў. Даследаванні апошніх гадоў паказалі, што ён жыццёва неабходны для прадухілення раку страўніка, мачавога пузыра, нырак, малочных залозаў, яечнікаў і тоўстай кішкі.

**Недастатковасць вітаміну К** прыводзіць да замаруджвання згусання крыві і развіцця павышанай кровачачывасці (гемарагічнага сіндрому).

Аднак паколькі вітамін К шырока распаўсюджаны ў харчовых прадуктах, а таксама сінтэзуецца мікрафлорай кішэчніка, яго недахоп у арганізме сустракаецца адносна рэдка. Часам ён бывае абумоўлены збоем усмоктвання пры захворваннях кішэчніка (хранічныя энтэрыты, энтэракаліты), парушэннях утварэння і сакрэцыі жоўці, неабходнай для засваення гэтага вітаміну (пры інфекцыйных і таксічных гепатытах, цырозе печані, жоўцекамянёвай хваробе, дыскінезіі жоўцевыводных шляхоў). Недахоп вітаміну К таксама можа развіцца пры парушэннях харчавання і працяглым прыёме антыбіётыкаў, у выніку чаго прыгнятаецца мікрафлора кішэчніка, якая сінтэзуе гэты вітамін.

**Дэфіцыт вітаміну К** — з'ява рэдкая, за выключэннем тых выпадкаў, калі штосьці парушае нармальныя рамкі харчавання або калі ўзаемадзеянні з лекамі ўплываюць на засваяльнасць вітаміну. Нават без харчовых крыніц папуляцыя страўнікава-кішачных бактэрый, якая нармальна функцыянуе, можа выпрацаваць дастаткова вітаміну К, каб дасягнуць мінімальнай патрэбнасці.



**Прыкметы дэфіцыту вітаміну К:** крывацёкі, парушэнне работы кішэчніка, балючыя працяглыя менструацыі, павышаная стамляльнасць, анемія.

Нованароджаныя, якія атрымліваюць выключна грудное малако, рызыкуюць атрымаць дэфіцыт вітаміну К, паколькі мацярынскае малако ўтрымлівае адносна малую колькасць вітаміну, а кішэчная флора ў іх яшчэ недастаткова разраслася, каб выпрацоўваць неабходную колькасць гэтага рэчыва. Таму ў большасці бальніц цяпер нованароджаным стандартна ўводзяць вітамін К у выглядзе ін'екцый, каб прадухіліць крывацёкі.

**Лішак вітаміну К** (ён адзначаецца выключна пры прыёме штучна сінтэзаванага вітаміну, а пры прыёме харчовых формаў выключаны) садзейнічае павелічэнню колькасці трамбацытаў, а разам з тым і павышэнню згусальнасці крыві. У сувязі з гэтым непажаданае ўжыванне ў вялікай колькасці прадуктаў, багатых на вітамін К, для хворых на варыкоз, трамбафлебіт і г.д.

### Дзе ўзяць?

Атрымаць дастатковую колькасць вітаміну К вельмі проста — неабходна штодзень есці зяленіва і агародніну: шпінат, спаржу, латук, квяцістую, брусельскую, белакачанную капусту, брокалі, кабачкі, пятрушку.

З жывёльных прадуктаў на вітамін К багатыя свіная печань, яйкі, рыбін тлушч.

Дзікарослыя крыніцы вітаміну К: лісце крапівы, стрэлкі, драсён перцавы, крываўнік звычайны, лісце каштана конскага, іголка хвоі і елкі, плады шыпшыны.

__Увага!__ Паколькі вітамін з'яўляецца тлушчарастваральным, для яго поўнага засваення (незалежна ад таго, з'яўляецца ён прадуктам дзейнасці бактэрый або атрыманы з ежай) у кішэчніку павінна прысутнічаць невялікая колькасць тлушчу.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**


ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Наперад ЧАРНОБЫЛЮ | МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ | СВАЯ СПРАВА | ЖЫРАНДОЛЯ | ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА | КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ | Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 12 400 рублёў на месяц<br>74 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 11 600 рублёў на месяц<br>69 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 900 рублёў на месяц<br>119 400 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 000 рублёў на месяц<br>108 000 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9 700—11 180 рублёў на месяц<br>58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 940—10 430 рублёў на месяц<br>53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13 134—14 080 рублёў на месяц<br>78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12 230—13 170 рублёў на месяц<br>73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна

# АДКАЗНА, АЛЕ І ЦІКАВА

## Так ставіцца да сваёй працы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Аб гэтым ён паведаміў на прэс-канферэнцыі, якая прайшла на базе свабоднай эканамічнай зоны «Гроднаінвест». Кіраўнік выканаўчай улады вобласці падзяліўся сваімі меркаваннямі па шэрагу ключавых пытанняў развіцця рэгіёна. У прыватнасці, Сямён Шапіра сказаў, што...**

### «Нельга жыць па прынцыпе: «Чым горш — тым лепш»

Старшыня аблвыканкама зазначыў, што ўзмацненне патрабаванняў да працы ўладных структур са зваротамі грамадзян — гэта не нейкі папулізм перад выбарамі, а прынцыповая пазіцыя. І «ўсе людзі, незалежна ад любога пункту погляду, — гэта нашы грамадзяне», да якіх улада будзе ставіцца з аднолькавай увагай. Галоўнае — каб усё было цывілізавана, без экстрэмізму.

— Сёння ў мяне на прыёме па асабістым пытанні была жанчына, якая прадстаўляе адну з апазіцыйных партый. Прыемны чалавек, не азлоблены, бачна, што не жыве па прынцыпе: «Чым горш — тым лепш». Паказала бюракратычную перапіску з чыноўнікамі. І калі прыведзенае ёй пацвердзіцца, то яна атрымае патрэбныя рашэнні. А хто не мае рацыі — будзе пакараны.

### «Кожны дырэктар абавязаны мець бізнэс-план развіцця прадпрыемства»

— І гэты план павінен ляжаць у мяне ў кабінеце. Буду асабіста кантраляваць, што робіцца, — зазначыў старшыня аблвыканкама.

Ён перакананы, што «мы нічога не зможам зрабіць у нашай краіне без шырокамаштабнай інвестыцыйна-інавацыйнай дзейнасці», будаўніцтва сучасных вытворчасцяў, укаранення перадавых тэхналогій. І такія прыклады ў Прынямонні ёсць. Гэта, у прыватнасці, і шэраг прадпрыемстваў — рэзідэнтаў СЭЗ «Гроднаінвест», якія эфектыўна выкарыстоўваюць тэрыторыю былога ваеннага гарадка ў вёсцы Новая Гожа Гродзенскага раёна, і кампанія «ЗОВ-ЛенЕўрамэбля», якая цяпер працуе ў тры змены, каб выканаць заказы.

Старшыня аблвыканкама прывёў у прыклад ААТ «Лідсельмаш», дзе ўстанавілі сучаснае абсталяванне па вытворчасці радыятараў еўрапейскага ўзроўню, не толькі практычна забяспечыўшы імі патрэбнасці ўсіх рэгіёнаў нашай краіны, але і з продажам за мяжу.

Неўзабаве, паведаміў Сямён Шапіра, у вобласці будзе створана інвестыцыйнае агенцтва з ліку моладзі, выпускнікоў ВНУ, на чале са спецыялістам, які ведае замежныя мовы і мае вопыт арганізацыі бізнэсу: «Спрабуем стварыць такую структуру, якая будзе вольная ад бюрактарычнага «грузу», што ляжыць на кожным чыноўніку».

Сярод прыярытэтных задач у Прынямонні на бліжэйшую перспектыву — будаўніцтва сучасных жывёлагадоўчых памяшканняў з прымяненнем найноўшых тэхналогій, цукровага завода, а таксама буйнейшай у краіне фабрыкі па вытворчасці мяса птушкі. Інтарэс да апошняга праекта, дарэчы, праявіў амерыканскі інвестар, з якім Сямён Шапіра пазнаёміўся ў Гродне падчас... фестывалю нацыянальных культур.

— Усе, хто хоча займацца бізнэсам на нашай зямлі і прыйдзе з добрымі ідэямі, будуць прымацца намі як самыя блізкія сябры і атрымаюць падтрымку, — сказаў старшыня аблвыканкама.

Пры гэтым кожны інвестыцыйны праект па стварэнні новага прадпрыемства, лічыць Сямён Шапіра, павінен улічваць існуючыя рэаліі. Так, павінна быць канкурэнтнае асяроддзе, каб нехта «дыхаў у спіну». Аднак нельга, каб новая кампанія была ў лепшых умовах, чым ужо існуючае прадпрыемства, за якім — лёс працоўнага калектыву і нават гарадоў.

### «Будзем сур'ёзна займацца зонай Аўгустоўскага канала»

Чакаецца, што неўзабаве будзе прыняты Указ Прэзідэнта Беларусі аб уключэнні тэрыторыі гэтай воднай артэрыі і прылеглых да яе зямельных участкаў (агульнай плошчай 5749,88 гектара) у свабодную эканамічную зону «Гроднаінвест». Ставіцца мэта выкарыстаць прадугледжаныя для рэзідэнтаў СЭЗ падатковыя льготы і прэферэнцыі і значна актывізаваць прыцягненне інвестыцый у стварэнне інфраструктуры турызму і адпачынку ў гэтым маляўнічым кутку Гродзеншчыны — будаўніцтва гасцініц, баз адпачынку, паляпшэнне дарог і транспартнага забеспячэння. Зразумела, з улікам рацыянальнага выкарыстання прыроднай і гісторыка-культурнай спадчыны.

Ужо праведзены перагаворы па супрацоўніцтве ў гэтых пытаннях з польскімі, літоўскімі партнёрамі. Сямён Шапіра чакае таксама ініцыятывы ад прадпрыемстваў і арганізацый, якім, пры іх жаданні, у зоне Аўгустоўскага канала можа быць прадастаўлена месца для будаўніцтва «дамка для сваіх супрацоўнікаў». Падтрымае ўлада і буйныя праекты, напрыклад, па новых санаторных аб'ектах на тэрыторыі Гродзеншчыны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

На сувязі з народам

# Для вокнаў сцены трэба ламаць?

**Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці Мікалай Дамашкевіч** падчас «гарачай лініі», на якую тэлефанавалі жыхары Віцебшчыны, выслухаў мноства скаргаў і заўваг. Некаторыя «сігналы» ад людзей проста не могуць не абурыць.

Вось, напрыклад, жыхарка Віцебска скардзілася на тое, што ў іх шматпавярховым доме, дзе, дзякуючы капітальнаму рамонту, мяняюць вокны, пашыраюць аконныя праёмы. Паводле яе слоў, чамусьці ставяць вокны памерам не 140 сантыметраў, як раней было, а на сем сантыметраў шырэй. «Дома дзеці, пенсіянеры, на вуліцы мароз», — расказвала гараджанка. — Навошта разбураць сцены? Выходзілі мы на розныя структуры, каб разабраліся, і да кіраўніцтва гарвыканкама, мэра. Абяцалі прыйсці разабрацца яшчэ 12-га, так і не прыйшлі». Галоўны інспектар паставіў задачу адказным асобам у той жа дзень выехаць на месца і разабрацца. Насамрэч, дзіўна, няўжо нельга было першапачаткова заказаць новыя вокны для замены старых такой жа шырыні і вышыні?

Аб іншай праблеме расказаў жыхар глыбінкі, які паведаміў, што ўжо некалькі гадоў не могуць паставіць нармальны пераход праз ручай у вёсцы Сасноўка Віцебскага раёна. Паводле яго слоў, за гэты час змяніліся тры старшыні сельскага Савета, а праз ручай пераходзіць і цяпер небяспечна. «Пешаходны масток у дрэнным стане, — паведамляе мужчына. — Пліту проста праз ваду паклалі без агароджы, а як па ёй пераходзіць? Тым больш па лёдзе можна ўпасці ў ваду і захварэць». Паскардзіўся грамадзянін і на тое, што пешаходную дарогу ад снегу не чысцяць. Маўляў, тэхнікі няма — так тлумачаць праблему тыя, ад каго залежыць яе вырашэнне.

Дзве жанчыны пацікавіліся нюансамі аказання дзяржаўнай дапамогі пры будаўніцтве жылля. І атрымалі інфармацыю, у які орган канкрэтна трэба звяртацца па каментарыі.

Медыцынскі работнік, што працуе ў віцебскім цэнтральным спартыўным комплексе, пацікавіўся: чаму ёй не павысілі заробак, як іншым медыкам? Як ёй тлумачылі, спартыўная медыцына не адносіцца да «агульнай», таму быццам не было падстаў. Памочнік Прэзідэнта даручыў разабрацца і знайсці магчымасць нейкім чынам аказаць спартыўнаму медыку падтрымку.

А ў старым доме ў Віцебску, па вуліцы Камсамольскай, які калісьці палонныя немцы аднаўлялі, яшчэ з 2008 года ідзе капітальны рамонт. Як растлумачыла жанчына, людзей выселілі. Паводле яе слоў, у падменны жыллёвы фонд. Рамонт іх дома, дзе раней не было цэнтралізаваных гарачага і газавага забеспячэння, зацягнулі. Людзі мараць або вярнуцца ў свае кватэры, або атрымаць новыя. Ды ніяк не вырашаецца гэтае пытанне.

А жыхарка райцэнтра Расоны вельмі эмацыянальна расказвала аб тым, што ёй у выніку лячэння анкалагічнага захворвання ампутавалі адну з грудзей, а інваліднасць чамусьці не далі. Муж пакінуў яе... Паводле яе слоў, медыцына — наогул праблемная тэма ў раёне. І зрабіла выснову аб тым, што, можа, таму моладзь і пакідае раён. Разабрацца ў сітуацыі даручылі кіраўніку сістэмы аховы здароўя вобласці.

А ў пасёлку Вярхоўе, які на ўскраіне Віцебска — у Чыгуначным раёне, паводле слоў тутэйшай жыхаркі, не арганізаваны вольны час для моладзі. І медыцынскі пункт даўно не сучасны: прыбіральні няма, калі з малым да педыятра прыходзіш, трэба чаргу чакаць на вуліцы, бо памяшканне малое.

А жыхары вуліцы Гагарына ў Віцебску спадзяюцца, што паліклініка, якая абслугоўвае жыхароў гэтай вялікай вуліцы, працягласцю некалькі кіламетраў, урэшце атрымае новае жыццё... Тым больш, што на вуліцы працягваецца капітальная рэканструкцыя...

Грамадзянам, якія выйшлі на сувязь, памочнік кіраўніка дзяржавы паабяцаў, што іх звароты будуць абавязкова трымацца на кантролі. У асобных выпадках даў абяцанні асабіста пракантраляваць, як вырашаюцца складаныя сітуацыі. І выехаць на месца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Твае правы

# За мяжу. І шэсць пенсій «наперад»

**Сітуацыі, калі чалавек у паважным узросце прымае рашэнне выехаць на пастаяннае месца жыхарства з Беларусі, узнікаюць не так часта. Тым не менш такія выпадкі ёсць, і шмат у чым яны з'яўляюцца аб'ектыўнымі, бо не сакрэт: многія маюць за мяжой тых жа сваякоў. Словам, прычына часта зразумелая. Аднак пытанні ўзнікаюць з іншым: што будзе з беларускай пенсіяй? І разабрацца з гэтым мы паспрабуем з дапамогай намесніка начальніка аддзела прызначэння і выплат пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вольгі Анатольеўны ШЫНГІРЭЙ.**

### Індэксацыі не будзе

Варта адразу ж заўважыць, што грамадзяне, якія выязджаюць на пастаяннае месца жыхарства за мяжу, маюць права атрымаць сваю пенсію за шэсць месяцаў наперад.

— Сума выплаты складзе памер 6-разовай пенсіі за месяц, у якім грамадзянін быў зняты з рэгістрацыйнага ўліку ў нашай краіне па месцы жыхарства — за выключэннем выпадкаў, калі іншы парадак прадугледжаны міжнароднымі дагаворамі, — удакладняе Вольга Шынгірэй. — Прычым надалей гэта сума не індэксуецца — нягледзячы на тое, што ў наступныя шэсць месяцаў можа быць праведзены пераразлік пенсій.

### Да апошняга не цягнуць

Для атрымання пенсіі перад выездам на пастаяннае жыхарства за мяжу неабходна звяртацца ў раённыя органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Пры гэтым грамадзянам Беларусі трэба напісаць заяву, прад'явіць пашпарт для пастаяннага пражывання за мяжой, які выдаецца органамі ўнутраных спраў, і адрасную даведку аб месцы жыхарства з адрасна-даведачнага бюро тых жа органаў унутраных спраў. А пакет дакументаў для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства — зноў жа заява, адрасная даведка аб месцы жыхарства і пашпарт ці іншы дакумент, якія прызначаны для выезду за мяжу і выдадзены адпаведным органам дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці ці звычайнага месца жыхарства.

Пры гэтым поўны пакет дакументаў упраўленнем ці аддзелам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне павінен быць разгледжаны на працягу 10 дзён.

— Здараецца, што ў грамадзяніна адраснай даведкі аб месцы жыхарства няма, — заўважае Вольга Шынгірэй. — У такім выпадку запытаць гэтую даведку ў адрасна-даведачным бюро могуць непасрэдна органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Такі запыт робіцца на працягу 5 дзён пасля паступлення заявы на пенсію. Аднак тут ёсць адна ўмова: на запыт павінен даць згоду сам пенсіянер. Бо ўвогуле такая інфармацыя з'яўляецца канфідэнцыяльнай.

Трэба мець на ўвазе і наступны нюанс. Пенсія за шэсць месяцаў наперад, якую па тых або іншых прычынах не ўдалося атрымаць перад выездам з Беларусі, за мяжу не пераводзіцца. Адпаведна, з афармленнем выплаты нельга цягнуць да апошняга.

### За мінусам «авансу»

— Часам здараецца, што пенсіянер пераязджае на пастаяннае месца жыхарства за мяжу, але праз пэўны час па тых або іншых прычынах змяняе сваё рашэнне і ўсё ж вяртаецца ў Беларусь, — заўважае Вольга Шынгірэй. — У такім выпадку для аднаўлення выплат у нашай краіне ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне неабходна падаць заяву. Пры гэтым аднаўленне выплат пачнецца з наступнага месяца за тым, за які пенсіянер ужо атрымаў грошы «наперад», але не раней за дзень рэгістрацыі па месцы жыхарства ў нашай краіне.

### Што будзе за мяжой?

Пасля атрымання 6-месячнай пенсіі ў Беларусі і выезду на пастаяннае месца жыхарства за мяжу выплаты ў нашай краіне спыняюцца. Таму ўзнікае пытанне: ці можна разлічваць на пенсію ў іншых дзяржавах?

— Краіны, куды пераязджае пенсіянер, будуць рабіць выплаты паводле свайго нацыянальнага заканадаўства ці паводле міждзяржаўных дамоўленасцяў толькі ў выпадку наяўнасці спецыяльных пагадненняў з Беларуссю, — тлумачыць Вольга Шынгірэй. — Прычым падобныя пагадненні на сёння заключаны толькі з дзяржавамі колішняга Савецкага Саюза — і тое за выключэннем Эстоніі, Азербайджана і Грузіі.

### Пры часовым выездзе — штомесяц

І, нарэшце, яшчэ адна распаўсюджаная з'ява. Пенсіянер выязджае за мяжу на вельмі працяглы час — скажам, на месяц ці нават на паўгода. Аднак пры гэтым не выязджае з Беларусі на пастаяннае месца жыхарства. Што будзе з пенсіяй у гэтым выпадку?

— У такім выпадку ставіць пытанне аб выплаце пенсіі за шэсць месяцаў наперад нельга, — адзначае Вольга Шынгірэй. — Налічэнне пенсіі ў Беларусі будзе рабіцца ў звычайным рэжыме — кожны месяц.

**Сяргей ГРЫБ.**

Рэзананс

# ЁСЦЬ ЖАДАННЕ? АЛЕ ЁСЦЬ І ЗАКОН

**ЖЫХАРКА Гродна Галіна ГЕРУС звярнулася на «гарачую лінію» чацвёртага Усебеларускага народнага сходу са скаргай, што амаль два гады Гродзенскі райвыканкам адмаўляе ёй у прыватызацыі зямельнага ўчастка ў садоўніцкім таварystве «Зара-Каробчыцы», які належыць ёй з 1980 года. Ад яе быццам «патрабуюць новы генплан коштам амаль дзесяць мільёнаў рублёў». «Дапамажыце!» — просіць 70-гадовая жанчына. Дык чаму ж гэтае, здавалася б, элементарнае пытанне не вырашаецца? І няўжо сапраўды цана пытання — вышэйзгаданая сума? Вось што адказвае на гэты конт намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар ЖУК (дарэчы, сёлета Галіна Сямёнаўна была на асабістым прыёме і ў яго, і ў старшыні аблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ):**

«Герус Г.С. рашэннем Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта ад 16 ліпеня 2010 г. № 545 перададзены ў пажыццёвае спадчыннае валоданне зямельны ўчастак у садоўніцкім таварыстве «Зара-Каробчыцы» плошчай 0,0672 га. Ёй накіравалі выпіску з гэтага рашэння для звароту ў РУП «Гродзенскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» для ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі на зямельны ўчастак.

Акрамя таго, райвыканкам на падставе пункта 9 Палажэння аб садоўніцкім таварыстве, зацверджанага Указам Прэзідэнта Беларусі ад 28 студзеня 2010 г. № 50, адмовіў у прадастаўленні Герус Г.С. самавольна занятага зямельнага ўчастка плошчай 0,0133 га, на якім узведзеныя хлеў і прыбіральня, паколькі ў дадзеным выпадку патрабуюцца змяненні ў праект арганізацыі і забудовы тэрыторыі таварыства.

Згодна з пунктамі 1,3 артыкула 223 Грамадзянскага кодэкса Беларусі, у выпадку будаўніцтва на самавольна занятым зямельным участку мясцовым выканаўчым і распарадчым органам прымаецца рашэнне аб вяртанні гэтага ўчастка і зносе самавольнай пабудовы. Тым не менш, Гродзенскі райвыканкам зрабіў спробу захаваць пабудовы Герус Г.С.: рашэнне аб іх зносе не выносілася, заяўніцы неаднаразова растлумачвалася неабходнасць змяненняў у праект арганізацыі і забудовы садоўніцкага таварыства «Зара-Каробчыцы». І таварыствам ужо прынята рашэнне аб адпаведных змяненнях — зразумела, за грашовыя сродкі Герус Г.С. Паводле звестак КУП «Праектнае бюро Гродзенскага райвыканкама», арыенціровачны кошт выканання неабходных работ складае 200 тысяч рублёў.

У падобных выпадках гэта адзіны варыянт, які ў поўнай меры адпавядае патрабаванням заканадаўства».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## СЕНА ЗАМЕНЕНА

**НА «ГАРАЧУЮ ЛІНІЮ» чацвёртага Усебеларускага народнага сходу паступіў зварот ад жыхаркі пасёлка Радашковічы Мінскага раёна пенсіянеркі, інваліда 3 групы Ганны Пяткевіч. Яна расказала, што трымае 4 кароў і штогод здае дзяржаве па 10 тон малака. Прасіла дапамагчы вырашыць пытанне замены 3 рулонаў няякаснага сена, якое ёй прывёз мясцовы СВК імя Я. Купалы. Сена аказалася гнілым, а старшыня СВК адмовіўся яго замяніць.**

Як патлумачыў нашаму журналісту сам **кіраўнік СВК імя Я. Купалы Іван ВЯРЭНІЧ**, сёння пытанне Ганны Аляксандраўны вырашана, сена заменена.

— Я на гэтай пасадзе працую ўсяго 3 месяцы, — патлумачыў Іван Арсеньевіч. — Яшчэ не да канца разабраўся ў сітуацыі з забеспячэннем сенам. Магу сказаць, што ў наступным годзе мы крыху зменім сістэму: будзем заключаць з насельніцтвам дагаворы і выдаваць сена за здадзеных цялят: на кожны кілаграм жывой вагі — тону сена, тону саломы і кілаграм зерня.

## ГЕНПРАКУРОР ПАГАДЗІЎСЯ З РАШЭННЕМ СУДА

**ЯШЧЭ АДЗІН зварот на «прамую лінію» паступіў ад жыхаркі пасёлка Лошніца Барысаўскага раёна Наталлі Мазоль. Яна заявіла, што другі год звяртаецца ў Лошніцкі сельвыканкам з просьбай выдзеліць ёй 3 соткі зямлі для «вырошчвання кветак, узвядзення клумбаў і іншых патрэб». Пры доме ўжо ёсць 25 сотак зямлі. Не дачакаўшыся станоўчага рашэння, Мазоль запісалася на прыём да губернатара Мінскай вобласці.**

— На самай справе ў грамадзянкі не 25, а 56 сотак зямлі каля жылога дома (дакладней дачы) па вуліцы Камсамольская, 74А ў пасёлку Лошніца, — патлумачыў сітуацыю **старшыня Лошніцкага сельскага выканаўчага камітэта Алег КАЖАМЯКІН**. — 25 сотак — для абслугоўвання і будаўніцтва жылога дома, астатнія — для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Ні сама жанчына, ні яе муж нідзе афіцыйна не працуюць. У мінулым годзе ў райвыканкам на іх паступіла скарга, што на грамадскай тэрыторыі ля дарогі, якая служыць праездам да зямельных участкаў жыхароў вуліцы Камсамольская, Наталля з мужам пабудавалі агароджу даўжынёй 23 метры і вышынёй 2,2 метра, а таксама ўзвялі эстакаду.

— У іх там клумбы разведзены, кветкі высаджаны, — дадаў Алег Кажамякін. — Малайцы, у гэтым плане ніякіх пытанняў. Але пабудова агароджы і эстакады была самавольная, не ўзгодненая. А землі — грамадскія, сельскага Савета. Я выдаў ім некалькі прадпісанняў на знос, але ніякай рэакцыі не дачакаўся. Папярэдзіў: вы перашкаджаеце праезду, людзі з-за вас не могуць на свае агароды ні гной падвезці, ні камбайн прыгнаць. У рэшце рэшт склаў пратакол за самавольнае будаўніцтва (паводле артыкула 21.12 Кодэкса Рэспублікі Беларусь адміністрацыйных правапарушэннях,) і накіраваў у суд. Раённы суд прыняў рашэнне і аштрафаваў іх на 20 базавых велічынь. Пасля рашэння суда, у маі, я зноў выдаў Наталлі Мазоль і яе мужу прадпісанне аб зносе. Яны зноў яго праігнаравалі. У жніўні на пасяджэнні сельвыканкама мы прынялі рашэнне даручыць Лошніцкаму ЖКГ правесці дэмантаж самавольна пабудаванай агароджы і эстакады, што і было зроблена ў лістападзе (звернем увагу, што асабістая тэрыторыя Наталлі Мазоль — 56 сотак — па-ранейшаму агароджана).

Пасля гэтага незадаволеная Наталля Мазоль была на прыёме ў Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь падчас правядзення ім прыёму грамадзян у горадзе Барысаве. Аднак ён пагадзіўся з рашэннем суда. Тады яна запісалася на прыём да старшыні Мінаблвыканкама Барыса Батуры.

— Жанчына некалькі разоў пісала заяву даць ёй гэтыя соткі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, але мы ёй тлумачылі, што дарогу для гэтых мэт выкарыстоўваць нельга. А дэкаратыўную агароджу ўвогуле можна ставіць толькі пры ўзгадненні з архітэктурнай службай раёна. Мы — сельвыканкам — нічога не парушылі і дзейнічалі выключна ў рамках існуючага заканадаўства. Я чатыры гады працую, яшчэ ні з кім не вёў такой актыўнай перапіскі, як з Наталляй Мазоль. Мы неаднойчы сустракаліся і размаўлялі з самой Наталляй і з яе мужам, выязджалі з камісіяй. Былі ў іх і галоўны архітэктар, і галоўны землеўпарадчык.

У Наталлі і яе мужа ёсць жаданне выкарыстоўваць у прыватных мэтах грамадскія землі, неабходныя для праезду, абгарадзіць іх, што будзе перашкаджаць іншым, падсумаваў у канцы размовы старшыня. Ім прапаноўвалі выдзеліць соткі ў іншым месцы, але Наталлі з мужам патрэбны менавіта гэтыя.

**Таіса ВАСІЛЬЕВА.**

## ПАЛІВА АБЫДЗЕЦЦА ДОРАГА

Два падлеткі (14 і 15 гадоў) залезлі ў гараж да 75-гадовага жыхара вёскі Стаўбун Веткаўскага раёна, каб зліць бензін з яго «жыгулёў». У выніку неасцярожнага абыходжання з агнём узнік пажар. Машына знішчана, а супраць школьнікаў заведзена крымінальная справа, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# МУЗЕЙНЫЯ ПРАДМЕТЫ ЗВАРОТУ НЕ ПАДЛЯГАЮЦЬ

**НА «ГАРАЧУЮ ЛІНІЮ» чацвёртага Усебеларускага сходу паступіла просьба ад пенсіянера з Мінска. ПУЗАНАЎ Барыс Львовіч просіць вярнуць узнагароды бацькі — Героя Савецкага Саюза — у сям'ю. Справа ў тым, што «пасля смерці таты ў адпаведнасці з Указам старшыні Вярхоўнага Савета СССР усе ордэны і медалі былі здадзены ў Прэзідыум ВС. А пасля 1977 года ўнеслі змены ва Указ, і ўзнагароды пачалі пакідаць у сям'і».**

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце, узнагароды Героя Савецкага Саюза Пузанава Льва Іларыёнавіча зараз знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яны былі перададзены музею ўдавой Пузанава Л.І. 6 красавіка 1966 года. Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», музейныя прадметы з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю і звароту былым уладальнікам, а таксама членам іх сям'і не падлягаюць. Таму задаволіць просьбу заяўніка аб звароце ў сям'ю ўзнагарод Пузанава Л.І не прадастаўляецца магчымым.

Згодна з артыкулам 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян», рашэнне, прынятае па звароце, можа быць абскарджана ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Акрамя таго, Барыс Львовіч цікавіцца: **«Чаму цэны на бульбу ў Беларусі — бульбяной краіне — вышэйшыя, чым ва Украіне, Польшчы і Расіі?».**

Мінгарвыканкам разглядзеў зварот спадара Пузанава аб цэнах на бульбу ў Беларусі, які паступіў на «гарачую лінію» 6 снежня 2010 года. Згодна з інфармацыяй, атрыманай з галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, пастаўка бульбы арганізацыям гандлю Мінска адбываецца як напрамую ад сельгасвытворцаў, так і з камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Партызанскае», якое стварае стабілізацыйныя фонды ў адпаведнасці з заданнем урада.

Рознічныя цэны на бульбу, якая пастаўляецца сельгасвытворцамі па прамых пастаўках, фарміруецца, зыходзячы з закупачнай цаны вытворцы, узровень якой не абмяжоўваецца гранічнай гандлёвай надбаўкай, устаноўленай у памеры не больш за 200 рублёў на кілаграм, і падатку на дабаўленую вартасць па ўстаноўленай стаўцы ў памеры 10 працэнтаў. Штогод у Мінску на міжсезонны перыяд ствараюцца стабілізацыйныя фонды бульбы, якая рэалізуецца ў сярэднім каля 8 месяцаў. Сёлета для бесперабойнага забеспячэння насельніцтва ў міжсезонны перыяд створана запасаў бульбы ў аб'ёме 23 804 тоны.

Рознічныя цэны на бульбу стабілізацыйных фондаў фарміруюцца, зыходзячы з закупачных цэн сельгасвытворцаў, выдаткаў па нарыхтоўцы, захоўванні, рэалізацыі, прыбытку, а таксама гранічнай гандлёвай надбаўкі, устаноўленай у памеры не больш за 200 рублёў на кілаграм і падатку на дабаўленую вартасць па ўстаноўленай стаўцы ў памеры 10 працэнтаў.

**Надзея ДРЫЛА.**

Пытальнік

# ПЕДАГАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ ДЛЯ НАСТАЎНІКА — НЕАБАВЯЗКОВАЯ?

**ПАВАЖАНАЯ «Звязда», у нашым Валожынскім раёне ў школах працуюць спецыялісты без педагагічнай адукацыі. Аднак у раённай газеце, адказваючы на пытанне, ці маюць права спецыялісты без профільнай педагагічнай адукацыі (эканамісты, юрысты і іншыя) выкладаць у школах, начальнік аддзела адукацыі райвыканкама Г. В. СМАТРОВА дала катэгарычны адказ: «Адназначна — не! І ў школах раёна такога прэцэдэнту няма. Адукацыйны працэс і работа з дзецьмі патрабуюць ад выкладчыкаў не толькі тэарэтычных ведаў, але і псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі». Хачу прывесці канкрэтныя факты: раней у Забрэзскай школе (яе ўжо закрылі), а цяпер у Гародзькаўскай школе працуе Алена Вячаславаўна Кучук. У яе няма педагагічнай адукацыі, але яна выкладала матэматыку, нямецкую мову, хімію, а зараз выкладае біялогію. Гэты выпадак не адзінкавы. У школах выкладаюць «настаўнікі» пасля заканчэння курсаў, нават пасля курсаў ЕШКА. А калі ў школу прыязджаюць праверкі, то такіх «настаўнікаў» без педагагічнай адукацыі проста хаваюць. Вядома, яны дысцыпліну трымаюць, зарплату атрымліваюць, а вось ведаў дзецям не даюць. Цікава, ці хацела б начальнік адзела адукацыі, каб яе дзеці вучыліся ў такіх «настаўнікаў»? У Яршэвіцкай школе, напрыклад, зараз чакаюць юрыста, які будзе выкладаць там дзецям гісторыю.**

**Між іншым, калі ў школу прыходзяць маладыя спецыялісты, яны вымушаны працаваць не па сваёй спецыяльнасці. Ім прапануюць пасаду педагога-арганізатара ці штосьці іншае. Зразумела, што тыя адпрацоўваюць два гады па размеркаванні, а затым з'язджаюць. Ці ў калектыве іх проста «з'ядаюць».**

**ГУД Ф.К.**, *Падневічы, Валожынскі раён.*

За высвятленнем фактаў, выкладзеных у лісце, мы звярнуліся да начальніка аддзела адукацыі Валожынскага райвыканкама Галіны Сматровай. І вось пра што нам удалося даведацца. Алена Вячаславаўна Кучук, якая згадвалася ў звароце ў рэдакцыю, і сапраўды закончыла не педагагічную ВНУ, а Беларускі дзяржаўны тэхналагічны інстытут, факультэт лясной і садова-паркавай гаспадаркі. Зараз выкладае ў Гародзькаўскай школе біялогію (раней выкладала яшчэ і хімію), таксама ў яе ёсць палова стаўкі педагога-псіхолага. Цяпер яна праходзіць перападрыхтоўку па спецыяльнасці «педагог-псіхолаг» у Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі (другі курс). Яе педагагічны стаж складае 10 гадоў і 7 месяцаў. У 2006 годзе ёй была прысвоена другая катэгорыя. У Яршэвіцкую школу і сапраўды прыйшоў новы настаўнік гісторыі. Балашка Алег Аляксеевіч закончыў у 1983 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (гістарычны факультэт) і мае спецыяльнасць «Выкладчык гісторыі і грамадазнаўства». А юрысту, які цікавіўся ў аддзеле адукацыі магчымасцю працаўладкавацца ў школу настаўнікам, было адмоўлена.

Ва ўпраўленні кадравай палітыкі Міністэрства адукацыі журналісту «Звязды» патлумачылі, што выпадкі, калі ў школы прыходзяць спецыялісты без профільнай педагагічнай адукацыі, і сапраўды маюць месца. Але такія спецыялісты абавязкова праходзяць перападрыхтоўку ў інстытутах развіцця адукацыі ці ў іншых установах адукацыі, заканчваюць курсы павышэння кваліфікацыі, атрымліваюць педагагічную адукацыю завочна...

Гэта асабліва актуальна для малакамплектных сельскіх школ. Менавіта ў такіх школах адзін настаўнік можа выкладаць адначасова некалькі дысцыплін, бо інакш у яго не будзе нагрузкі, а школа, у сваю чаргу, не зможа знайсці прадметніка на невялікую колькасць гадзін. «Для таго, каб атрымаць кваліфікацыйную катэгорыю, спецыялісту, які працуе ў школе з дзецьмі, патрэбны не толькі педагагічны стаж, які не замяняе педагагічную адукацыю, але і перападрыхтоўка па педагагічнай спецыяльнасці, правядзенне адкрытых урокаў. Таму, калі ў настаўніцы ёсць другая кваліфікацыйная катэгорыя, значыць, яна змагла пацвердзіць сваю прафесіянальную кампетэнтнасць», — выказала сваё меркаванне **начальнік упраўлення кадравай палітыкі міністэрства Зоя ЮЖЫК**.

Рэха публікацыі

## ДЗЯКУЙ «ЗВЯЗДЗЕ» АД НАСТАЎНІКАЎ...

*...грубасці ў школе стала менш*

Кожны раз, калі заўважаю на старонках «Звязды» працяг настаўніцкай дыскусіі, абуджаецца і набірае моц надзея на справядлівасць. Хоць, на жаль, сёння гэтае слова шмат у каго выклікае скептычную або нават цынічную ўсмешку. Таму, як настаўнік і чалавек, хачу падзякаваць смеламу, вопытнаму, прынцыповаму, умеламу і надзвычай чалавечнаму калектыву журналістаў «Звязды». Тым больш што ініцыяваны газетай розгалас даў выразны плён.

Дзякуй Вам за тое, што стала трохі лягчэй дыхаць у беларускай правінцыйнай школе! Шмат яшчэ павінна змяніцца. Але пачалі Вы, хоць крызісу ў адукацыі не бачыў толькі сляпы.

Калі метадысты раённага аддзела адукацыі прыедуць у школу з «набегу», не знойдуць там памылак у афармленні «мора» школьнай дакументацыі і не складуць па выніках праверкі адпаведных папер «карнага» зместу, мясцовае начальства не ўбачыць плёну іхняй працы. Начальства засумняваецца ў іх прафесійнай прыдатнасці... Значыць, пакуль не «накапаюць» — не з'едуць. Зноў будуць жаночыя слёзы і «разбор палётаў» у кабінеце дырэктара і на педагагічнай нарадзе па выніках чвэрці.

Хоць, трэба зазначыць, што грубасці з боку адміністрацыі школ апошнім часам стала менш. І за гэта, дарагая «Звязда», таксама вялікі дзякуй!

**Базыль.**

## МАТЭМАТЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ СТРАЧВАЕ НАЙВАЖНЕЙШЫ ЧЫННІК...

**(на артыкул Надзеі Нікалаевай «З матэматыкай не сябруюць не толькі беларускія школьнікі» ў нумарах за 15 і 16 снежня)**

Настаўнікі матэматыкі наўрад ці пагодзяцца, што гэтак усё добра ў нашай адукацыі, нагэтулькі добра, што нават змяняць у сістэме цэнтралізаванага тэсціравання анічога не трэба. Далёка не ўсё тут можа задаволіць аб'ектыўны погляд. Прыведзеная статыстыка пра вынікі сёлетняга тэсціравання толькі пацвярджае гэта. Калі ў БДУ на бюджэт паступілі абітурыенты з сярэднім балам 52 па фізіцы, то што казаць пра іншыя ВНУ? Гэта лічацца нармальным? Вытлумачэнне нізкіх вынікаў ЦТ тым, што цяпер выпускнікі школ масава імкнуцца ва ўніверсітэты, аніяк не можа быць «ахоўнай граматай» для арганізацый, што вызначаюць стандарты адукацыі. Сістэму тэсціравання, калі яна непазбежная ў нашых умовах, трэба развіваць. ЦТ насамрэч мае не толькі кантрольную функцыю. Змест заданняў ЦТ вызначае арыенціры для настаўнікаў і больш за тое — уплывае на якасць сярэдняй адукацыі. Калі ўключыць, прыкладам, у тэст па матэматыцы задачы з параметрамі, дык адразу пачнецца адпаведная праца з гэтай вельмі карыснай для лагічнага развіцця школьнікаў тэмай на ўроках. У школьных падручніках яна нібы прысутнічае, але паколькі на ЦТ яе няма, то настаўнікі праходзяць паўз яе. Гэткія рэаліі нашай сістэмы. Таму і нізкія балы па прадмеце. Матэматычная адукацыя страчвае найважнейшы чыннік — патрэбу ў доказе. У нашых тэстах няма часткі С, як у Расіі, дзе трэба даваць поўныя, доказныя рашэнні. Змены ў гэтым напрамку сістэмы ЦТ, упэўнены, павысяць узровень нашай адукацыі і вывядуць яе са стану кансервацыі.

**Іван Сяргеевіч.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

*УТВЕРЖДАЮ*
*Директор ПК ООО «БАРЭФ»*
*В.А Барановский*
*«22» декабря 2010 года*

**«Строительство двух жилых многоквартирных домов со встроенно-пристроенными помещениями торгового и общественного назначения по ул. 50 лет Победы в п. Восточный в г. Минске» (Жилой дом №2 по генплану)**

**Производственно-коммерческое общество с ограниченной ответственностью «БАРЭФ»** информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**1. Информация о застройщике.**
ЗАСТРОЙЩИК: **ПК ООО «БАРЭФ»** зарегистрировано Минским горисполкомом решением № 1557 от 28.12.2000 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №1000504357.

**2. Ранее реализуемые проекты.**
Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет ПК ООО «БАРЭФ» реализованы следующие проекты:
- «Строительство гостиницы на базе отдыха «Дружба»;
- «Реконструкция спального корпуса №1 с надстройкой этажа на базе отдыха «Дружба»;
- «Реконструкция станции второго подъезда в/з №6 «Островы»;

**3. Специальное разрешение (лицензия).**
Лицензия № 02250/0189707 на право осуществления деятельности «Проектирование строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» выдано Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь на основании решения от 13.03.2006 года. №52 сроком на 5 лет и действительна до 13.03.2011 года.

**4. Информация о проекте.**
**Цель строительства объекта –** строительство объекта «Строительство двух жилых многоквартирных домов со встроенно-пристроенными помещениями торгового и общественного назначения по ул. 50 лет Победы в п. Восточный в г. Минске». Предметом договора является строительство жилого помещения.

**Объект долевого строительства** – одноподъездный многоквартирный жилой дом №2 (по генплану) по ул. 50 лет Победы в жилом поселке Восточный г. Минска.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома 8 месяцев, согласно проекту.

Начало строительства – III квартал 2010 года.

Предполагаемый срок окончания строительства – I квартал 2011 года.

**5. Застройщиком получены.**
- Акт выбора места размещения земельного участка от 6 апреля 2010 года, утвержденный Председателем Мингорисполкома 7 апреля 2010 года (внесение изменений в акты выбора места размещения земельного участка от 12 февраля 2008 года, утвержденный Председателем Мингорисполкома 19 февраля 2008 года, и от 14 октября 2008 года, утвержденный Председателем Мингорисполкома 19 ноября 2008 года).
- Выписка из решения Минского городского исполнительного комитета от 26 ноября 2009 года №2783 (1) «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменений в решение горисполкома».
- Заключение РУП «ГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» № 0712-8-2009 от 6 августа 2009 года.
- Разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-206Ж-031/10 от 10.08.2010 года.

**6. Договор генерального подряда** с ОАО «МАПИД» №244/ПО от 17 июня 2010 года.

**7. Жилой дом** запроектирован крупнопанельным, односекционным, с техническим подпольем и техническим чердаком на базе изделий серии М-464, 10-этажным (на 1-ом этаже расположены офисы и административные помещения), пристроенным к ныне существующему жилому дому № 3 по ул. 50 лет Победы. Площадь жилого здания – 2474 кв. метра, общая площадь квартир – 1953,63 кв. метра.

Количество квартир – 36.

Для доступа лиц с ограниченными возможностями передвижения в административные помещения и помещения товарищества собственников предусматривается устройство индивидуальных подъемников.

**8. Объекты долевого строительства и их количество.**

| Типы квартир | Жилая площадь м² | Общая площадь без летн./пом. м² | Общая площадь, летн./пом м² с кофф. 0,7 | 2-10 этажи | Всего |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 к | 14,03 | 38,14 | 41,15 | 2 | 2 |
| 1к | 17,1 | 38,08 | 40,9 | 0 | 0 |
| 2к | 30,96 | 56,19 | 59,01 | 4 | 4 |
| 3к | 45,35 | 73,24 | 76,06 | 4 | 4 |
| **Итого:** | | | | | **10** |

На данном этапе, по договору участия в долевом строительстве жилых помещений, предполагается реализация **10 квартир**. Из них две двухкомнатные и две трехкомнатные квартиры будут реализовываться для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

**9. Цена одного квадратного метра общей площади составляет 3 500 000 белорусских рублей.**

**Цена одного квадратного метра общей площади, для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 2 662 690 белорусских рублей.**

**Сведения о благоустройстве.**
Озеленение, организация дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

После заключения договора создания объекта долевого строительства Дольщик получает право по согласованию с Застройщиком (ПК ООО «БАРЭФ») посещать место строительства многоквартирного жилого дома и иного объекта недвижимости в установленное Заказчиком время, соблюдая при этом требования техники безопасности, и в установленном порядке знакомиться с ходом строительства.

Ознакомление дольщиков с объектами долевого строительства и дополнительной информацией для заключения договоров создания объектов долевого строительства осуществляется ПК ООО «БАРЭФ» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Академическая, 6, здание Б1/К, кабинеты №3 и №7, контактные телефоны 285-79-64, 331-59-17.

Режим работы: понедельник – четверг $8^{30}$ – $17^{30}$; пятница с $8^{30}$ – $16^{15}$ (обед $13^{00}$ – $13^{45}$), выходной – суббота, воскресенье.

